ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 4 (1078) 26 студзеня 2013 г. Кошт 4000 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

СТАРТ ДАДЗЕНЫ!

С. 2, 4

"ПАДРАБЯЗНАСЦІ ПАВЕДАМЛЮ ПАЗНЕЙ, ПА ВЯРТАННІ..."



С. 14

"ГЭЙ, ДУМКА ЎДАЛАЯ, ТЫ МЯНЕ НЯСІ ПА РОДНАЙ СТАРОНЦЫ..."

С. 13

КУЛЬТУРНЫ КОД БРЭСТЧЫНЫ

ВЫЯЗНАЯ

РЭДАКЦЫЯ

ГАЗЕТЫ "КУЛЬТУРА"

Фота Юрыя ІВАНОВА

С. 5 — 12

Магілёўскі кірмаш праектаў

Сёння, 26 студзеня, пад час святкавання 75-годдзя Магілёўшчыны, у абласным цэнтры распачалася рэалізацыя праекта "Магілёў — Культурная сталіца Беларусі 2013 года". На ўрачыстую цырымонію з гэтай нагоды запрошаны прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры, Магілёўскага аблвыканкама, дзеячы культуры і мастацтва нашай краіны і замежжа, прадстаўнікі абласцей Беларусі і гарадоў-пабрацімаў Магілёва.

Гораду ўручаны сертыфікат новага сталічнага статуса. Працягам урачыстасцей стала ўшанаванне асоб, што займелі на Магілёўшчыне званне "Чалавек года". Потым адбыўся святочны канцэрт з удзелам лепшых аматарскіх творчых калектываў і эстрадных выканаўцаў — ураджэнцаў Магілёва і вобласці: Іны Афанасьевай, Ірыны Дарафеевай, Іскуі Абалян, Пятра Ялфімава, Алены Ланской, Івана Буслая.

Гадавая сталічная праграма Магілёва — надзвычай насычаная. Тут выступяць Нацыянальны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам А.Анісімава, салісты балета Вялікага тэатра Беларусі і Марыінскага тэатра Санкт-Пецярбурга, артысты Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, Гродзенскага абласнога драмтэатра, а таксама — Беларускі дзяржаўны ансамбль "Песняры", Акадэмічны ансамбль песні і танца імя А.Аляксандрава з Расіі, Дзяржаўны ансамбль танца "Жок" з Малдовы...

Мяркуецца рэалізацыя шматлікіх творчых праектаў. Пройдуць, да прыкладу, кінавестываль "Тураўская восень", культурна-асветніцкая акцыя "Ноч музеяў", конкурс мультымедыйных прэзентацый "Старадаўні Магілёў". Адкрыецца новая экспазіцыя ў Музеі гісторыі Магілёва.

А праект "З крыніц адвечнай прыгажосці" прадугледжвае наладжванне ўжо другога па ліку міжнароднага форуму "Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства". Маладзёжнай тэматыцы прысвечаны праект "Жыццё, рух, радасць, захапленне". Тэатральныя акцыі запланавана рэалізаваць пад эгідай праекта "Рэальнасць у пражэктарах ілюзій".

У ліку не менш адмысловых мерапрыемстваў — Дні культуры гарадоў-сталіц СНД, конкурс па добраўпарадкаванні абласнога цэнтра, міжнародны пленэр па скульптуры з каменя, пленэры жывапісцаў і фотамастакоў.

Пад час акцыі "Кірмаш праектаў" любы ахвотны зможа самарэалізавацца і ўласнай творчасцю дадаць новую фарбу ў гарадскі культурны партрэт.

Андрэй СТАРЖЫНСКІ

Шорт-ліст Года кнігі

24 — 25 студзеня Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь праводзіла Нацыянальны конкурс "Мастацтва кнігі". Асаблівую значнасць гэтай падзеі надае тая акалічнасць, што конкурс падводзіў вынікі Года кнігі, які адначасова быў юбілейным годам нашых Песняроў — Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Для большай аб'ектыўнасці адбор лепшых кніг 2012 года праходзіў у два этапы. 24 студзеня працавала мастацка-экспертная рада, якая разглядала лонг-ліст, каб ператварыць яго ў шорт-ліст. А наступным днём ужо ўласна журы працавала з шорт-лістом. Кансультант упраўлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі Валерый Рагалевіч паведаміў нам пра намінацыі конкурсу.

Найперш гэта Гран-пры "Трыумф", разам з якім уручаецца Дыплом Францыска Скарыны. Потым ідуць тэматычныя намінацыі: "Літфармат" — за мастацкую літаратуру, "Падручнік новага стагоддзя" — за навучальную літаратуру, "Фотапогляд" — як вынікае з назвы, фотаальбомы, "Залатыя скрыжалі" — за даведачна-энцыклапедычную літаратуру, "Арт-кніга" — выяўленчае мастацтва, факсімільныя, рэпрынтныя і бібліяфільскія выданні, "Эўрыка" — навуковая і навукова-папулярная літаратура, і, нарэшце, "Духоўнасць" — за рэлігійную літаратуру.

Далей ідуць прэміі спецыяльныя. "За ўнёсак у захаванне духоўнай спадчыны", "За прапаганду чытання" (яе атрымліваюць не выдавецтвы, а ўстановы і арганізацыі, якія спрыяюць распаўсюджванню друкаванага слова ў грамадстве: бібліятэкі, кніжныя крамы, клубы і г. д.), "Садружнасць" — за сумесныя праекты. Паводле традыцыі, ствараецца прэмія для спецыяльна запрошанага госця. Калі такім госцем на расійскіх конкурсах бывае Беларусь, дык прэмія за лепшую нашу кнігу называецца "Белыя росы".

Апошняя намінацыя — "Майстэрства". Летась яе пасмяротна прысудзілі Мікалаю Казлову за значны ўнёсак у развіццё мастацтва кнігі. Сёлета прэмій будзе тры: лепшаму ілюстратару, лепшаму дызайнеру, лепшаму фотамастаку.

У лонг-лісце былі прадстаўлены 173 кнігі, у шорт-ліст трапіла 59 — не больш за 5 па кожнай намінацыі.

Вынікі конкурсу будуць абвешчаны 6 лютага на ўрачыстасці ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

П.В.

Ляці, заяўка, на "...Базар"!

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пачало прыём заявак на ўдзел у адборачных турах да міжнародных конкурсаў "Славянскага базару ў Віцебску" — дарослага і дзіцячага.

Прыём заявак працягнецца да 15 сакавіка. Потым, паводле традыцыі, пройдуць самі адборы — і мы даведаемся, хто прадставіць нашу краіну на гэтых двух прэстыжных спаборніцтвах: Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск" і Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе, якія пройдуць у рамках нашага фестывалю мастацтваў у ліпені бягучага года.

У дарослым конкурсе могуць прымаць удзел спевакі ад 18 да 31 года, у дзіцячым — ад 7 да 12-ці гадоў. Але галоўным патрабаваннем на абодвух застаецца дастатковая ранейшая "апрабацыя": вопыт канцэртных выступленняў, паспяховы ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах ды фестывалях. Іншымі словамі, на конкурсы "Славянскага базару ў Віцебску" традыцыйна з'язджаюцца пераможцы іншых спаборніцтваў, каб яшчэ раз памерацца творчымі сіламі.

Заяўкі трэба накіроўваць у дзяржаўную ўстанову "Цэнтр культуры "Віцебск", аддзел міжнароднага супрацоўніцтва, (210026, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь, вул. Маякоўскага, 1, тэл.: +375-212 364-437; +375-212 373-340; факс: +375-212 374-949) каштоўнай бандэроллю, з паметкай: "Адборачны тур конкурсу "Віцебск" (дарослыя)" або "Адборачны тур конкурсу "Віцебск" (дзеці)". Спяшайцеся: на роздум засталося менш за два месяцы!

Хто яны, мецэнаты культуры?

Сёлета ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады будзе праведзена рэспубліканская акцыя па прысуджэнні звання "Мецэнат культуры Беларусі".

Адпаведнае рашэнне прыняло Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Прэтэндаваць на гэтае званне могуць фізічныя і юрыдычныя асобы, якія аказалі бязвыплатную дапамогу або ахвяравалі сродкі на падрыхтоўку ды ажыццяўленне культурных мерапрыемстваў, праектаў. Паводле даных Міністэрства культуры, летась на развіццё культурных праектаў у краіне было выкарыстана каля 12 мільярдаў спонсарскіх сродкаў.

Упраўленні культуры абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў, дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Міністэрству культуры, гаспадарчыя таварыствы гэтай сферы (са згоды мецэната) альбо сам мецэнат падаюць у Міністэрства культуры заяўкі з імёнамі мецэнатаў не пазней за 1 сакавіка.

Пры выбары мецэната года ўлічваюцца сацыяльная і грамадская значнасць аказанай дапамогі, яе сістэмнасць і доўгачасовасць, а таксама памер зробленых летась ахвяраванняў.

Сярод асноўных задач рэспубліканскай акцыі — спымуляванне развіцця ў краіне мецэнацтва, прыцягненне грамадскай увагі да спонсарскай падтрымкі ў сферы культуры. Пад час акцыі мяркуецца наладжванне прэс-канферэнцый, сустрэч мецэнатаў з дзеячамі культуры і мастацтва.

Трактоўка помніка Максіму Танку

22 студзеня ў галерэі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў былі прадстаўлены на разгляд журы конкурсныя праекты помніка Максіму Танку ў Мядзеле. Сярод чатырох праектаў журы мусіла вызначыць лепшы. Помнік будзе стаяць у цэнтральнай частцы райцэнтра побач з невысокім будынкам з рысамі "сталінскага ампіру".

Адзін з праектаў увасабляе Танка, які сядзіць на ганку бацькоўскай хаты, другі — на беразе возера. Яшчэ адзін адлюстроўвае класіка, які стаіць на камені. У членаў журы ўзніклі сумневы наконт таго, што яны гарманічна ўпішуцца ў ландшафт. З'явіліся і пытанні адносна трактоўкі вобраза. Перавага была аддадзена варыянту, дзе паэт прадстаўлены ў руху: нібыта ён імкліва ідзе па брукаванай дарозе. Журы на чале з першым намеснікам міністра культуры Уладзімірам Карачэўскім адзначыла выразны сілуэт скульптуры і насычаную сімволіку: творчасць як дарога. Эскіз прыняты для далейшай распрацоўкі.

Аўтары гэтай праектнай прапановы — скульптары Іван Міско і Аляксандр Фінскі, архітэктар Армен Сардараў. Карэспандэнт "К" павіншаваў пераможцаў і запытаўся пра канцэпцыю помніка. Іван Міско і Армен Сардараў выказалі задавальненне тым, што журы правільна зразумела ідэю творчага калектыву. Аўтары насамрэч трактуюць творчасць як рух, як шлях, а сімвалам руху з'яўляецца дарога.

Іван Акімавіч згадаў, што ведаў Максіма Танка асабіста, але стварыць выяву паэта пры яго жыцці не давялося. З натуры Танка ляпіў толькі Заір Азгур. Скульптары імкнуліся выявіць у помніку ўласцівы Танку ў жыцці і творчасці дэмакратызм у спалучэнні са шляхетнай вытанчанасцю. Армен Сардараў дадаў, што невыпадкова дарога брукаваная: гэта адбітак тых рэалій цывілізацыі, у якіх фарміраваўся талент паэта. А тое, што помнік стаіць нібыта на пагорку — знак нашай традыцыі, згодна з якой вартае ўвагі мусіць быць вонкава вылучана з ландшафту.

П.В.

Часопіс "Мастацтва". 30 гадоў!

Нашы калегі з рэдакцыі часопіса "Мастацтва", якая ўваходзіць у склад рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва", гэтымі днямі адзначаюць 30-годдзе з дня выхаду першага нумара выдання. З гэтай нагоды калектыў рэдакцыі павіншаваў міністр культуры Рэспублікі Беларусь.

Шчыра віншуем нашых сяброў з выдатнай датай! Зычым плёну і дасягнення новых вышыняў! А гэтат фота супрацоўнікаў РВУ "Культура і мастацтва" з міністрам культуры Барысам Святловым зроблена ў офісе рэдакцыі.

Шаноўныя сябры!

За трыццаць гадоў часопіс "Мастацтва" стаў неад'емнай часткай духоўнай прасторы рэспублікі. Гэта ўнікальнае прафесійнае выданне, якое канцэнтруе ўвагу сваіх чытачоў на самых гарачых кропках сучаснага арт-поля. На яго старонках публікуюцца як грунтоўныя аналітычныя артыкулы, так і аператыўныя рэцэнзіі на актуальныя падзеі мастацкага жыцця, — тым самым выданне прадстаўляе шырокую панараму беларускага мастацтва. Часопіс імкнецца захоўваць пазіцыю аб'ектыўнага аглядальніка і трымае руку на пульсе сучаснага арт-працэсу. Крытычныя артыкулы, апублікаваныя ў "Мастацтве", істотна ўплываюць на культурную сітуацыю ў краіне/

Гэта выданне, якое ствараецца прафесіяналамі для прафесіяналаў і неабыякавых аматараў — усіх, хто ўважліва сочыць за самымі значнымі арт-падзеямі. Аўтарамі часопіса з'яўляюцца лепшыя мастацтвазнаўцы краіны, чые меркаванні набываюць значэнне аб'ектыўнай экспертнай ацэнкі. Часопіс не толькі аналізуе творчы працэс — "Мастацтва" вылучае лепшыя набыткі нацыянальнай і сусветнай культуры і спрыяе выхаванню чытачоў на яе ўзорах.

Ад усёй душы жадаю калектыву часопіса прафесійных поспехаў, невычэрпнага творчага натхнення, новых здзяйсненняў, міру і дабра! Няхай і надалей прыбывае ў скарбонцы створанага калектывам выдання за трыццаць гадоў, а сённяшні юбілей надасць імпульс імклівага руху наперад — да новых дасягненняў і поспехаў!

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь
Барыс СВЯТЛОЎ

Купала: партрэт у бронзе для Вільнюса

27 студзеня ў сталіцы Літоўскай Рэспублікі пройдуць урачыстасці з нагоды юбілею купалаўскай "Паўлінкі": сто гадоў таму адбылася яе прэм'ера.

Арганізатары святочных мерапрыемстваў — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і наша пасольства ў Літве. Беларускую дэлегацыю на ўрачыстасцях будзе ўзначальваць намеснік міністра культуры краіны Тадэуш Стружэцкі.

Распачнецца святкаванне цырымоній замены мемарыяльнай шыльды ў гонар беларускага Песняра. Тая, першая, была устаноўлена на пачатку 2000-х гадоў, і, як высветлілася з часам, атрымалася не надта ўдалай. Кажуць, што і партрэтнай выяве Купалы не стае падабенства, і тэкст кепска чытаецца, асабліва калі шыльда намакае пасля дажджу… Ініцыятыву пасольства па замене шыльды падтрымала Міністэрства культуры нашай краіны. Беларуская дзяржава прафінансавала праект. Зрабіць новую шыльду было даручана двум маладым скульптарам Сяргею Аганаву і Вользе Нячай. Па словах Сяргея, яны арыентаваліся не на канонічныя выявы Купалы, дзе ён немалады і стомлены, а на фотаздымкі Віленскага перыяду ягонай творчасці. Іх Купала — малады і рамантычны. Партрэт Песняра дапаўняе верш, ягонай жа рукою і напісаны — факсіміле ў бронзе.

У той жа дзень адкрыецца выстаўка з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. Гэта дакументы, што датычацца Віленскага перыяду ў жыцці і творчасці Песняра. Асобны раздзел прысвечаны "Паўлінцы": там, у прыватнасці, прадстаўлена калекцыя афіш спектакля за розныя гады, з розных гарадоў. Самым каштоўным экспанатам дырэктар музея Алена Ляшковіч назвала эскізы касцюмаў да "Паўлінкі" работы народнага мастака Беларусі Аскара Марыкса.

Завершыцца свята ў Вільнюсе канцэртам фальклорнага гурта "Купалінка" Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Артысты зладзяць імпрэзу па матывах "Паўлінкі".

П.В.

Увага!

"ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ"

па актуальных пытаннях развіцця бібліятэчнай справы.

28 студзеня, у панядзелак, ад 14-й да 16-й гадзіны ў Інфацэнтры "Культура-інфа" будзе працаваць "гарачая лінія" з удзелам галоўнага спецыяліста ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталлі ЗАЗЯРКОЎСКАЙ.

Пытанні можна задаваць па тэлефонах: (8-017) 290-22-50 і 292-99-18 — непасрэдна 28 студзеня, альбо загадзя — праз электронную пошту: kultura@tut.by і ў http://www.facebook.com/kimpressby.

Мая любімая грашовая купюра — 50 000 Br: яе колер нагадвае мне паэтычную назву нашай краіны — "Сінявокая", а выява Мірскага замка выклікае гонар за гістарычную спадчыну Беларусі. Але іншым разам думаецца: Мірскі замак на грошах — гэта цудоўна, але наколькі эканамічна рэнтабельныя нашы нацыянальныя брэнды — і Мір у прыватнасці? Памятаю, у савецкі час з Тракайскага замка, які, у адрозненне ад Мірскага, фактычна ўяўляе з сябе муляж-наватвор, немалую карысць мела, у тым ліку і ў матэрыяльным эквіваленце, уся Літва. А ці мае прыбытак з Міра хоць бы родны яму райцэнтр Карэлічы?

Эканоміка культуры: тэрыторыя кааперацыі намаганняў

Дадатковая вартасць: Таўэр заменім сваім?

Карэлічы пры Міры: прыбыткі ад фестывалю не перакрываюць выдаткаў, але форум працуе на брэнд

Адсюль да ўсяго блізка

Мэтай маёй камандзіроўкі на Карэліччыну было найперш высветліць, што раён мае ад наяўнасці на сваёй тэрыторыі нацыянальнага брэнда — аб'екта Сусветнай спадчыны UNESCO.

Ад Карэлічаў аўтобусныя маршруты скіраваны ў адзін бок на Гродна — праз Навагрудак і Ліду, у другі — на Нясвіж праз Мір. Ад Навагрудка ёсць адгалінаванне на Любчу, ад Міра — на Стоўбцы, ад Нясвіжа — на Слуцк. Калі б на гэтую схему ды накласці адпаведную інфраструктуру ў выглядзе вялікіх і малых гатэляў, крамаў з элементамі нацыянальнай экзотыкі, аграсядзіб, забаўляльных комплексаў, дык атрымалася б шыкоўнае турыстычнае кольца, прамінуць якое — проста немагчыма. Што, можа, надзвычай важнае ў дадзенай сітуацыі — Карэлічы знаходзяцца ў самым цэнтры гэтай прасторы. Зручнае месца: адсюль да ўсяго блізка. Але ці лічаць яго зручным для развіцця мясцовыя жыхары?

Тэндэнцыя супраць тэндэнцыі

Пра культурны чыннік мне распавядае начальнік аддзела культуры Карэліцкага райвыканкама Нэлі Маісеенка. Яна — мясцовая. Кажа, што ад пачатку працы на пасадзе сутыкнулася з праблемай хранічнага характару: сённяшніх работнікаў у блізкай перспектыве няма кім замяніць. Прытым што ўмовы для маладых спецыялістаў, па словах Нэлі Аляксандраўны, — нібыта, спрыяльныя: ніхто з маладых спецыялістаў сферы на Карэліччыне не жыве на прыватнай кватэры, бо забяспечваюцца жыллём.

Зрэшты, сітуацыя ў культурнай сферы пэўным чынам праецыруе агульны стан спраў у раёне. Так, начальнік аддзела разумее, што культурная сфера наўпрост звязана з эканамічнай. У Карэлічах за апошнія дзесяць гадоў насельніцтва зменшылася з 10 тысяч да 6,5. Так што крыўдаваць на работнікаў культуры, якія не затрымліваюцца ў Карэлічах, не мае сэнсу: іх "міграцыя" — гэта проста адбітак агульнай тэндэнцыі.

На думку Нэлі Аляксандраўны, Карэлічы шчыльна прывязаны да Міра. І не толькі ў культурным сэнсе, але і эканамічна. А значыць, развіццё інфраструктуры вакол замка можа стаць чыннікам эканамічнага ўздыму Карэлічаў.

Пакуль што, аднак, і ў Міры праблем хапае. Калі сюды прыязджае чарговая экскурсія ў чалавек сорак, дык іх няма дзе пасяліць і няма як накарміць. Некалькі экскурсій адначасова — для мястэчка ўжо праблема. У Міры — усяго тры кавярні і рэстаран замка. Але прыватнікі, якія бачаць перспектыву, укладаюць грошы ў інфраструктуру. Нядаўна мінскі камерсант прыдбаў з такой мэтай былую дзіцячую бібліятэку і яшчэ збіраецца прыкупіць зямлю да яе. Мірскіх праблем агулам гэта не вырашае, ды ўсё ж тэндэнцыя — пазітыўная. Прынамсі, так хочацца думаць…

Тры фестывалі. Усе — брэндавыя

Намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльнай сферы і ідэалогіі Руслан Абрамчык — таксама мясцовы чалавек. Акрамя іншых службовых абавязкаў, Руслан Юр'евіч непасрэдна адказвае за маштабныя культурныя мерапрыемствы. Зразумела, нікога не здзіўлю, калі скажу, што для ўсіх большменш важных карэліцкіх імпрэз базай і сцэнічнай пляцоўкай з'яўляецца Мір.

На працягу года тут праходзяць тры фэсты. Найперш, фестываль "Мірскі замак", які ладзіць аркестр Міхаіла Фінберга. Фэст мае дзесяцігадовую гісторыю, адпаведна — сталыя традыцыі ды распрацаваную канцэпцыю. Сімфанічныя канцэрты традыцыйна адбываюцца ў мірскім касцёле, а эстрадныя — у Карэліцкім доме культуры. Па словах Руслана Юр'евіча, на гэты фэст хапае сродкаў райбюджэту.

Другая імпрэза — "Вечары ў Мірскім замку". Яна ладзіцца разам з тэлеканалам "АНТ". Канцэрты цягам трох дзён наведвае блізу 30 тысяч гледачоў. Акрамя канцэртаў, праходзяць выстаўкі і кірмашы. Пабачыць "Вечары ў Мірскім замку" прыязджаюць госці не толькі з блізкіх паселішчаў Гродзеншчыны, але і з Мінска, Віцебска, Брэста, Баранавічаў… Большую частку сродкаў на арганізацыю фестывалю выдаткоўвае тэлебачанне, свой унёсак робіць Міністэрства культуры. Але арганізацыйныя клопаты выпадаюць на карэліччан. Скажам, неабходна размясціць сто чалавек тэхнічнага персаналу, які забяспечвае правядзенне канцэртаў. Пад гэта акрамя гасцініцы даводзіцца задзейнічаць інтэрнаты навучальных устаноў. А яшчэ — забяспечыць неабходныя меры бяспекі для наведвальнікаў.

Шмат і руціннай працы. Вось патрэбна трыццаць цэментных блокаў для пабудовы сцэны. У Навагрудку трэба пазычыць крэслы для партэра. У штабе мерапрыемства адных толькі кіраўнікоў прадпрыемстваў — некалькі дзясяткаў. Усе супрацоўнікі дамоў культуры так ці інакш задзейнічаны ў гэтым фестывалі. Такім чынам, хоць асноўныя сродкі — ад АНТ, асвойваюцца яны праз высілкі карэліччан. Прыбытак ад фестывалю не перакрывае выдаткаў раённага бюджэту на гэтую справу. Увогуле, вельмі цяжка падлічыць, колькі той фестываль каштуе раёну. Але ў дадзеным выпадку, як мяркуе Руслан Юр'евіч, прыбытак — не мэта. "Гэты фестываль працуе на нашу будучыню, бо спрыяе пазітыўнаму іміджу Карэліччыны", — кажа ён.

Трэці фестываль мае на мэце рэканструкцыю сярэднявечнай культуры і называецца "Спадчына стагоддзяў". У Міры ён ладзіўся двойчы. Згаданы фэст пачынаўся на самадзейным узроўні, калі "рыцары" ставілі свае намёты ля сцен Мірскага замка і ладзілі нейкія тэатралізаваныя дзеі. А два гады таму гэтае мерапрыемства набыло новы арганізацыйны ўзровень. Кіраўнік аднаго з мінскіх рыцарскіх клубаў Іван Краўцэвіч выйшаў на Карэліцкі райвыканкам з просьбай дапамагчы правесці ля "намоленых" сцен замка той форум. Прычым адразу з прыцэлам на міжнародны ўзровень, ды каб замацаваць фэст за Мірам як найбуйнейшы такога кшталту ў нашай краіне. Паразуменне было знойдзена: фэст адбыўся ў 2011 годзе, хоць удзел райвыканкама абмежаваўся аргпадтрымкай. Сабраў ён амаль 500 удзельнікаў, не лічачы гасцей.

Па словах начальніка аддзела культуры, пакуль Карэліччына прыбытку ад гэтых фэстаў фактычна не мае. Найлепшы на сёння вынік, рэкордная, так бы мовіць, лічба — 30 мільёнаў на рахунак райаддзела за тры дні "Вечароў у Мірскім замку". З іншага боку, мясцовае кіраўніцтва разглядае выдаткі на правядзенне фэстаў як укладанне ў рэкламу, у раскрутку брэндаў, а значыць — у будучыню. Зароблены ж тут грошы лічацца прыбыткам ад пазабюджэта і скарыстоўваюцца на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры.

На згаданых фестывалях задзейнічаны гаспадарчая група, інжынерна-тэхнічны персанал і адміністрацыйны апарат райаддзела. Творчыя кадры абавязкова прысутнічаюць на фестывальных імпрэзах, бо для іх гэта — прафесійная вучоба. Некаторыя самадзейныя калектывы Карэліччыны выступаюць на фестывалі "Мірскі замак", у прыватнасці — дзіцячыя ансамблі. Зразумела, на другасных пляцоўках. Але ёсць спадзяванне, што роля мясцовага чынніка ў мірскім фестывальным коле будзе ўзрастаць.

> Нейкай адчувальнай выгоды ад мірскіх фестываляў эканоміцы раёна няма. А клопатаў і выдаткаў — шмат. Хіба што нейкія грошы зарабляюцца праз паслугі гасцініцы, кавярняў. І яшчэ мае прыбытак гандаль — як мясцовы, так і прывазны, мінскі, які разгортваецца тут пад час фэстаў. Раён мог бы зарабляць на фестывалях, каб білеты на канцэрты зрабілі б платнымі. Іншая справа — ці пойдуць у такім разе людзі на тыя канцэрты, калі дзеля гэтага давядзецца раскашэльвацца самім. Гэта ўжо не проста мясцовы патрыятызм, а крок да сапраўднага набыцця брэндам дадатковай вартасці. І наступнай яго "манетызацыі". Але ці ёсць такое цяпер і ці магчымае ў бліжэйшай будучыні?

Давялося сутыкнуцца з юрыдычнымі праблемамі. Справа ў тым, што згаданае рыцарскае аб'яднанне не мела статуса юрыдычнай асобы, і прадстаўляць яго інтарэсы на падставе адпаведнай дамовы мусіла адна турыстычная фірма. А таксама мелі месца праблемы кантролю за рухам вялікай колькасці гледачоў, якія прыехалі на фэст. Наступным годам арганізатарам было прасцей: па-першае, ужо меўся досвед, а па-другое — рыцарскі клуб стаў юрыдычнай асобай. Гэтым разам фэст сабраў 800 рыцараў, а да арганізацыі спрычынілася ўпраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама.

Сёння, у час падрыхтоўкі да III Міжнароднага фестывалю гістарычнай рэканструкцыі эпохі Сярэднявечча "Спадчына стагоддзяў", Карэліцкі райвыканкам гатовы сам зрабіць фінансавы ўнёсак у яго правядзенне, бо з'явілася адпаведная графа ў раённым бюджэце.

Сёлета фестываль "Спадчына стагоддзяў" афіцыйна ўключаны ва Усходнееўрапейскае кола рыцарскіх фэстаў. У гэтым коле — Расія, Украіна, Польшча, Чэхія… А цяпер — і Беларусь. У ім для кожнага фестывалю — жорсткія каляндарныя рамкі.

У коле прыцягнення

Так, сёння ў Міры рэалізуюцца праекты, у якія паступова ўцягваюцца і блізкія Карэлічы, і Гродна, і жыхары сталіцы. Праўда, рэй тут вядуць мінчане, а мясцовыя жыхары — на другасных ролях… А між тым, менавіта мірскія фэсты забяспечваюць сезонную занятасць, а ў перспектыве могуць стаць гарантам прафесійнай запатрабаванасці культработнікаў Карэліччыны. Глядзіш, і цякучка кадраў спыніцца…

Гэтыя фестывалі — справа дзяржаўная. Роля прыватных прадпрымальнікаў тут — нязначная: яны, хіба што, з'яўляюцца са сваімі таварамі ды паслугамі на кірмашы. Як прыватныя асобы прыязджаюць у Мір і народныя майстры. Ад зароблены прыватнікамі грошай адлічэнні ў мясцовы бюджэт не ідуць. Таму, зразумела, карэліцкім уладам зручней супрацоўнічаць з арганізацыямі мясцовай спажывецкай кааперацыі…

Так сітуацыю акрэслілі мне ў аддзеле культуры. Колькі штрыхоў дадала начальнік эканамічнага аддзела райвыканкама Наталля Кныш. Яна зазначае, што нейкай адчувальнай выгоды ад мірскіх фестываляў раёну, яго эканоміцы насамрэч няма. А клопатаў і выдаткаў — шмат. Хіба што нейкія грошы зарабляюцца праз платныя паслугі: гасцініцы, кавярняў. І яшчэ мае прыбытак гандаль — як мясцовы, так і выязны, мінскі, які разгортваецца тут пад час фэстаў.

Наталля Кныш пацвярджае маю тэзу пра недахоп месцаў прытулку для турыстаў, для гасцей фэстаў у Міры, пра тое, што нават падсілкавацца — праблема. Напрыклад, для тых, хто хацеў сустрэць Новы год у Міры (сёння гэта, у асноўным, расіяне), гасцінічныя нумары для пражывання знаходзяць і ў Карэлічах, і ў Баранавічах. Зараз у гарадскім пасёлку адведзены тры пляцоўкі пад будаўніцтва гасцініцы, забаўляльнага комплексу і гасцявых дамкоў. Але інвестара пакуль няма… "Шукаем", — кажа Наталля Аляксандраўна.

Яна лічыць, што раён мог бы зарабляць на фестывалях, калі білеты на канцэрты зрабілі б платнымі. Іншая справа — ці пойдуць у такім разе людзі на тыя канцэрты, калі дзеля гэтага давядзецца раскашэльвацца самім. На яе думку, напачатку, калі музычныя праекты ў Міры толькі разгортваліся, праграмы канцэртаў былі больш цікавыя, і эстрадныя зоркі на іх "зіхцелі" ярчэй. А зараз прыязджаюць збольшага невядомыя маладыя выканаўцы… "Так што трэба добра падумаць, перш чым рабіць канцэрты платнымі", — рэзюмуе Наталля Кныш. І я разумею, што перспектывы зарабляння Карэлічамі на культуры падаюцца эканамісту вельмі цьмянымі. Прынамсі, цяпер.

Погляд звонку

А якой бачыцца эканамічна-культурная сітуацыя вакол Міра стрыжнявой постаці фестывалю "Мірскі замак" Міхаілу Фінбергу? Маэстра патлумачыў, што яго справа — творчая. Аднак ён вельмі ўдзячны мясцовым спецыялістам у Міры і Карэлічах, якія робяць усё магчымае для таго, каб фестывальныя канцэрты прайшлі на высокім узроўні: "Яны — сапраўдныя прафесіяналы". Добрымі словамі згадаў спадар Фінберг і раённае кіраўніцтва за яго ўважлівае стаўленне да культуры ўвогуле і музычнай — у прыватнасці.

Кіраўнік камунікацыйнага агенцтва Андрэй Эзерын, (менавіта яно стала піяр-партнёрам Замкавага комплексу "Мір") лічыць, што гарадскому пасёлку з малымі чалавечымі і матэрыяльнымі ресурсамі на дадзеным этапе ягонай гісторыі проста наканавана быць базай для рэалізацыі ініцыяваных звонку амбіцыйных праектаў. І канал "АНТ", і аркестр Фінберга, і "рыцары" — гэта мінчане. Але, прызнацца, цяжка ўявіць, што ў Міры сёння можа ўзнікнуць, скажам, рыцарскі клуб, здольны ўразіць сталіцу. Тое ж датычыцца і іншых праяў культурнага жыцця. Такі музейны комплекс, як Мірскі, кажа Эзерын, можа існаваць праз дапамогу спонсараў альбо зарабляючы грошы самастойна: "У дадзены момант манетызацыя брэнда, інакш кажучы — ягоная самаакупнасць, залежыць ад таго, наколькі ён можа зацікавіць менеджараў ды спонсараў культурных праектаў". А ці прычакаем "манетызацыі" ад узаемадзеяння Міра, Мірскага замка і Карэлічаў?

Пра нешта падобнае кажа менеджар-культуролаг Святлана Папсуй. Брэнд, на ейную думку, становіцца паўнавартасным, калі набывае дадатковую каштоўнасць (як тавар — дадатковую вартасць). Гэта калі нешта "шырока вядомае ў вузкіх колах" становіцца проста шырока вядомым, без іранічнага ўдакладнення: "А Беларусы сёння па-ранейшаму больш ведаюць пра лонданскі Таўэр, чым пра свае Мір і Нясвіж. Каб Міру стаць сапраўдным брэндам, патрэбны намаганні ў нацыянальным маштабе. А значыць, і буйныя культурныя акцыі на яго тэрыторыі".

■■■

Для выпрацоўкі стратэгіі на перспектыву існуюць, як мне падаецца, два шляхі. Адзін: чакаць са сталіцы лёсавызначальнага рашэння і грошай на яго рэалізацыю. Другі: распрацаваць уласны прывабны бізнес-план па турызме. Так, мірскія фэсты маюць і надалей развівацца. Менавіта ў блізкіх да Міра Карэлічах найзручней ствараць сістэму абслугі турыстаў і гасцей мірскіх фэстаў. А калі аб'яднацца ў плане намаганняў з Навагрудкам, Іўем, Дзятлавам? Вось тут прыдасца і ўдалае месца прывязкі Карэлічаў для стварэння турыстычнага маршруту пад такія аб'екты, як Мір, Нясвіж, Любча, Гродна, — у адным, але не аднадзённым туры… Апошняе, у сваю чаргу, будзе спрыяць культурна-эканамічнай кааперацыі некалькіх сумежных раёнаў.

Скажаце, утопія? А ці многія напачатку верылі ў адраджэнне Мірскага замка?..

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Карэліцкі раён — Мінск

Працяг тэмы ў разрэзе кааперацыі міжраённых намаганняў — у наступных нумарах.

Калектыў Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" выказвае шчырыя і глыбокія спачуванні рэдактару аддзела часопіса "Мастацтва" Белявец Алесі Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім непапраўным горам — смерцю бацькі ЧАРНЯЎСКАГА Міхася Міхайлавіча, знакамітага археолага, дацэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Рэпрэзентацыя пасля рэстаўрацыі

— Першая думка, што прамільгнула пасля знаёмства з музеем, — яго трэба неадкладна ратаваць. Я не перабольшваю. У першую чаргу, маю на ўвазе фонды, якія знаходзяцца ў вельмі кепскім стане. Яны раскіданы па ўсім горадзе: сёння музейныя прадметы знаходзяцца ў пяці месцах, у некаторых з якіх няма адпаведных умоў. Тым больш, у Нацыянальным гістарычным музеі сабраны найбольш знакавыя прадметы, якія ўсебакова характарызуюць нашу спадчыну, найбольш яркія артэфакты культуры мінулых эпох.

— Было непрыемна ў свой час даведацца, што ўнікальныя каштоўнасці Нацыянальнага гістарычнага захоўваюцца літаральна ў прыбіральні....

Днямі Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь узначаліў колішні дырэктар Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, экс-начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Алег РЫЖКОЎ. Літаральна пасля прадстаўлення калектыву і агляду фондаў Алег Гар'евіч, эксклюзіўна для нашага выдання, пагадзіўся расказаць пра сваё бачанне развіцця музея — адной з "візітовак" нашай краіны.

— Так, на жаль, даводзіцца канстатаваць, што частка музейных прадметаў зараз захоўваецца ў прыбіральні былой паліклінікі. Таксама асобная частка знаходзіцца на самым верхнім — трынаццатым — паверсе, дзе пастаянна пячэ сонца, ці наадварот, у падвалах, дзе высокая вільготнасць. Усе гэтыя рэчы — у каробках, заматаных скотчам. Пра якую дэманстрацыю ці рэстаўрацыю прадметаў можна казаць, калі няма ўмоў захоўвання? Гэта вельмі сур'ёзная сітуацыя, якая патрабуе неадкладнага вырашэння. Акрамя таго, мы зараз не можам годна прэзентаваць фонды шырокай грамадскасці, бо 90 працэнтаў з агульнай колькасці музейных прадметаў патрабуюць рэстаўрацыі. Чым больш мы будзем адкладваць ці закрываць вочы на праблему, тым больш згубім унікальных артэфактаў, якія дайшлі да нас з глыбокай даўніны…

— Не адкрыю сакрэт, калі скажу, што пад час вашага кіравання Гомельскі палацава-паркавы ансамбль стаў адным з самых папулярных музейных аб'ектаў у маштабе ўсёй краіны. Наколькі рэальна дасягнуць такіх поспехаў з Нацыянальным гістарычным музеем?

— Безумоўна, хацелася б зрабіць гэта ўсё цягам года. Але ў падобнай сітуацыі больш мэтазгодным будзе правядзенне якаснай рэстаўрацыі памяшканняў установы. Выкарыстоўваючы толькі наяўныя плошчы, немагчыма выклікаць у наведвальнікаў той набор эмоцый, якія ён павінен атрымаць ад музея такога рангу. Любы чалавек — ці то маленькае дзіця, ці то госць нашай краіны — павінен захапіцца нашай гісторыяй!..

У мяне ёсць бачанне таго, як развіваць музей, у тым ліку, каб ён захоўваў свае функцыі ва ўмовах рэстаўрацыі. У будучым мы павінны працаваць у двух кірунках. Па першае, тут, у сталіцы, рэпрэзентаваць гісторыю і культуру Беларусі. Завітваючы ў наш музей, кожны мусіць адчуваць, найперш, гонар за сваю краіну. На гэта павінна працаваць усё: пачынаючы ад памяшканняў і заканчваючы інтэрактыўнымі элементамі экспазіцыі. Другі важны кірунак: годна прадставіць нашу спадчыну за мяжой. Мяркую, што пад час рэстаўрацыі музея патрэбна зрабіць некалькі паўнавартасных перасоўных выставак — з добрым абсталяваннем, падачай, арыгінальнымі прадметамі, а не планшэтамі, якімі ўжо нікога не здзівіць. І паказаць нашы брэнды ў блізкім і далёкім замежжы — на пляцоўках нашых партнёраў.

— Вы кажаце пра неабходнасць рэстаўрацыі саміх прадметаў. А ці хапае ў музеі спецыялістаў?

— Кадравы патэнцыял у музеі, перакананы, — вельмі добры. Нашы супрацоўнікі могуць ствараць любыя праекты — ад навуковых да выставачных. А ўласна з рэстаўратарамі я паспеў пазнаёміцца ў першы ж дзень працы. Вельмі ўзрадавала тое, што ў нас ёсць высокапрафесійныя спецыялісты па аднаўленні прадметаў з дрэва, паперы, іншых матэрыялаў. Адно што — маецца пэўны недахоп рэстаўратараў жывапісу. Да сярэдзіны бягучага года рэстаўратары могуць працаваць у сценах былой паліклінікі, у будынку, што належыць Міністэрству аховы здароўя…

— У свой час было праведзена грамадскае абмеркаванне канцэпцыі Нацыянальнага гістарычнага музея. А як ацэньваеце яе вы?

— Сёння мы можам арыентавацца толькі на наяўныя плошчы. Па маіх падліках, калі нашы памяшканні вызваліць Музей прыроды і экалогіі краіны і "Белвідэацэнтр", то пасля прыстасавання навакольных гаражоў ды пляцоўкі побач з музеем можна будзе паказаць каля 10 працэнтаў фондаў, што вельмі добра для нацыянальнага музея нават па еўрапейскіх мерках. Акрамя таго, тая канцэпцыя патрабуе дапрацоўкі і па іншых аспектах. Да прыкладу, сёння для кожнага музея важна тое, як візуальна падаецца матэрыял, як ён уздзейнічае на чалавека. Я прытрымліваюся думкі, што кожны музей павінен мець сваё адметнае аблічча. Мы не павінны капіраваць, скажам, Нацыянальны мастацкі, альбо выставачныя галерэі, а мусім працаваць са сваімі профільнымі партнёрамі ў замежжы, у нечым арыентавацца на іх.

— На якія аспекты ў жыцці Нацыянальнага гістарычнага музея вы плануеце звярнуць асноўную ўвагу?

— У сваёй музейнай дзейнасці я заўсёды быў праціўнікам, каб па разнарадцы музей наведвалі групы школьнікаў, якія сёння складаюць асноўны кантынгент наведвальнікаў нашай установы. Перакананы, што гэта можа прывесці да адваротнага эфекту. Таму будзем імкнуцца, каб, найперш, візіты разавых наведвальнікаў сталі найбольш масавымі. Для гэтага трэба стварыць не толькі шыкоўную экспазіцыю, але і годную інфраструктуру. У кожнага госця музея павінна быць магчымасць завітаць у добрую сувенірную краму, адмысловую кавярню, якая б прапаноўвала традыцыйную беларускую кухню, арыентуючыся на розныя перыяды яе развіцця. Упэўнены, калі створым такую структуру, то будуць і чэргі ў музей. Гэта абсалютна рэальна, асабліва калі ўсе нашы задумы будуць падтрыманы як дзяржавай, так і спонсарамі, у тым ліку тымі, якія зараз уваходзяць у апякунскі савет музея...

Кастусь АНТАНОВІЧ

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах сённяшняга нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 або kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце тэму на www.facebook.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

Каб развівацца, неабходна рухацца і ніколі не супакойвацца, спыняючыся на дасягнутым. Думка гэтая, здаецца, павінна даўно перайсці ў катэгорыю прафесійных аксіём. Ды на практыцы нярэдка сутыкаешся з сітуацыяй, калі аднойчы знойдзены ўдалы баланс, мадэль, прынцып хочацца закансерваваць. Сёння — пра вопыт адваротнага кшталту.

Тэатр: трукі трэнду

Як у Магілёве шукаюць публіку

"Сакрэт" паспяховага форуму — імкненне да разнастайнасці пры фарміраванні афішы. Яна мае на ўвазе не толькі разнажанравую палітру творчых эксперыментаў ды пастановак. Здавалася б, запрашэнне да ўдзелу тэатраў, якія ў мінулыя гады выклікалі глядацкі інтарэс, магло б стаць "гарантам" камерцыйнай акупнасці фестывальных спектакляў, аднак арганізатары робяць стаўку на навінкі.

Арганізатары Міжнароднага маладзёжнага форуму "М.@rt.кантакт", які вось ужо ў восьмы раз пройдзе ў Магілёве, не схільныя спыняцца на дасягнутым яшчэ і таму, што маладзёжны фармат фестывалю проста-такі абавязвае не толькі жыва адгукацца на актуальныя тэатральныя тэндэнцыі, але і заставацца ў трэндзе, уласнымі сіламі ствараючы "падзеі" ды "з'явы". 21 студзеня ўжо распачаўся продаж білетаў на спектаклі сакавіцкага форуму. За што ж магіляўчане і госці сёлетняй Культурнай сталіцы Беларусі і СНД спяшаюцца выкласці свае грошы? Чым "М.@rt.кантакт" працягвае прываблівацъ і шараговых гледачоў, і прафесіяналаў ад тэатра?

"Сакрэт" першы — імкненне да разнастайнасці пры фарміраванні афішы форуму. Яна мае на ўвазе не толькі разнажанравую палітру тых творчых эксперыментаў ды пастановак, што прапаноўваюцца гледачам, але і пастаяннае абнаўленне калектываў-удзельнікаў. Здавалася б, запрашэнне да паўторнага ўдзелу тэатраў, якія ў мінулыя гады выклікалі шырокі глядацкі інтарэс, магло б стаць своеасаблівым "гарантам" камерцыйнай акупнасці фестывальных спектакляў, аднак арганізатары на чале з дырэктарам тэатра Андрэем Новікавым робяць стаўку на навінкі — прадчуванне сустрэчы з тым, чаго яшчэ не ведаеш.

І гэта цалкам справядліва як у дачыненні да замежных калектываў, так і ў адносінах да беларускіх пастановак, што будуць прадстаўлены гледачам: поруч з "Блазнам Балакіравым, або Прыдворнай камедыяй" Р.Горына, заяўленай гаспадарамі фестывалю, айчынная тэатральная моладзь будзе "прадэманстравана" ў спектаклях "Над прорваю ў жыце" Дж.Сэлінджара Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы і "Шоўк" А.Барыко Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек.

Другім прынцыповым наватарствам сёлетняга форуму акажацца больш актыўнае, у параўнанні з папярэднімі гадамі, "хаджэнне ў народ". Іншымі словамі, інтэрвенцыя тэатральных мерапрыемстваў у маладзёжны асяродак. Адной з такіх акцый мае стаць запрашэнне ў праграму вулічнага спектакля: знаны не толькі ў Еўропе, але і ў Беларусі тэатр "Biuro Podrozy" пакажа на плошчы ля Ратушы спектакль "Пахаванне Кармэн". Думаецца, ён не толькі адкрые для магілёўскіх тэатралаў яшчэ адну форму бытавання сучаснага тэатра, але і пэўным чынам зацікавіць, "зачэпіць" мінакоў — тых, для каго тэатральнае мастацтва пакуль што "далёкае" і невядомае.

"Трукам" ад арганізатараў стане выхад работы фестывальных лабараторый, якія штогод выклікалі вялікі інтарэс ды бурныя дыскусіі сярод прафесіяналаў, у больш шырокае кола "спажыўцоў" — студэнцкі асяродак магілёўскіх ВНУ, не абазначаных культурна-мастацкай профільнасцю. Акурат тут адбудуцца чыткі ў рамках "Майстэрні маладой рэжысуры", якія ажыццяўляць беларуска Кацярына Аверкава, а таксама Глеб Чарапанаў з Расіі і Шаміль Дыйканбаеў з Кыргызстана.

Адзінае, што па-ранейшаму застаецца стабільным, — дастаткова дэмакратычная цэнавая палітыка "М.@rt.кантакту": самыя дарагія білеты на спектаклі не перавысяць кошту ў 100 тысяч, а многія фестывальныя мерапрыемствы, такія, як вулічны спектакль або чыткі, будуць бясплатнымі.

Таццяна КОМАНАВА



Брэстчына: культурны код

Гэтым разам каманда выязной рэдакцыі газеты "Культура" выправілася на Брэстчыну. Чым запомнілася трохдзённае дэталёвае даследаванне вобласці журналістам выдання? Які плён працы прафесіяналаў сферы культуры краю можна пераняць і ў іншых рэгіёнах? Пра гэта — на тэматычных палосах "Брэстчына: культурны код".

Старшыня Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Канстанцін СУМАР:

"Стратэгія эфектыўнасці і эканомікі, і культуры: па-гаспадарску ставіцца да рэсурсаў на карысць сучаснікаў ды нашчадкаў"

Што на Брэстчыне дарагога каштуе, або "Калі чалавек нешта мае за душой, гэта не трэба хаваць"

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР ведае на памяць колькасць вясковых бібліятэк вобласці і з захапленнем наведвае музеі самабытных майстроў. Гэтыя штрыхі да яго партрэта выявіліся пад час сустрэчы губернатара з удзельнікамі нашай выязной рэдакцыі і падаліся нам папраўдзе красамоўнымі. Як і тое, што распачалі мы гутарку адразу ж на беларускай мове. "Часам менавіта яна дазваляе трапна ды сакавіта выказаць тую або іншую думку", — сказаў Канстанцін Андрэевіч. Зрэшты, гэта далёка не адзіная рыса, якая сведчыць, што кіраўнік абласнога выканаўчага камітэта — асоба, да культуры не абыякавая...

— 2013-ы быў абвешчаны ў краіне Годам беражлівасці. Безумоўна, гэты лейтматыў будзе актуальны і ў галіне культуры, і пытанне тут — толькі ў выбары правільнай стратэгіі, якая паўплывае на канкрэтныя дзеянні. Што і як мы павінны асабліва берагчы і зберагаць?

— Думаю, стратэгія тут можа быць толькі адна: мы павінны яшчэ раз непрадузята ацаніць эфектыўнасць сваёй працы і выявіць тыя затраты, ад якіх можна адмовіцца без шкоды для агульнай справы. Але, бадай, самае галоўнае — гэта навучыцца па-гаспадарску выкарыстоўваць усё тое, што намі створана за мінулыя гады. Дый не толькі гады — стагоддзі! Нельга дапусціць, каб былі страчаны набыткі нашых продкаў — тыя ж помнікі спадчыны.

Пераканы, што абвяшчаючы Год беражлівасці, Кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка меў на ўвазе не толькі эканомію, але таксама і гэты, куды больш глабальны, аспект. Нам трэба навучыцца беражліва ставіцца да ўсіх тых рэсурсаў, што назапашаны на нашай зямлі, умець выкарыстоўваць іх на карысць сучаснікаў ды нашчадкаў. У аднолькавай ступені гэта датычыцца і эканомікі, і культуры.

Згадаем, да прыкладу, унікальны музей разбяра па дрэве Івана Супрунчыка ў вёсцы Цярэблічы Столінскага раёна, дзе маляўніча адлюстравана гісторыя жыцця нашых продкаў. Я быў там некалькі разоў і штораз здзіўляўся ўбачанаму ды пачутаму. Альбо вясковы музей яшчэ аднаго самабытнага майстра — Мікалая Тарасюка з Пружаншчыны... Гэта наш скарб, і цяпер перад намі стаіць задача яго захаваць ды актуалізаваць — скажам, у мэтах турызму або выхавання.

— Наколькі вядома, вы асабіста прымаеце ўдзел у вырашэнні актуальных пытанняў аховы спадчыны, і такая пазіцыя прыносіць свой плён: па частцы помнікаў, якія аднаўляюцца за кошт мясцовых бюджэтаў, рэгіён, мабыць, лідзіруе...

— Сапраўды, Брэстчына стала ці не першай вобласцю краіны, дзе праца ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны была пастаўлена на сістэмныя рэйкі: створаны міжведамасны Каардынацыйны савет, і ён сапраўды плённа працуе. Больш за тое: у абласным бюджэце з'явіўся канкрэтны артыкул, што прадугледжвае выдаткаванне сродкаў на рэстаўрацыю. Можа, сумы там пакуль фігуруюць і не зусім тыя, якія хацелася б, але.. Праца спакваля ідзе, і яе вынікі — ужо навідавоку. Многія дзівяцца, пабачыўшы, як пераўвасобіўся за апошнія гады палац Нямцэвічаў у Скоках. На жаль, агульныя эканамічныя складанасці крыху запаволілі яго рэстаўрацыю, аднак яе лагічны фінал ужо не за гарамі.

Згадайма і куды большы па сваіх аб'ёмах помнік спадчыны — Косаўскі палац. Яго аднаўленне фінансуецца на парытэтных асновах з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. Сродкі выдаткоўваюцца своечасова, паспяхова асвойваюцца, праца ідзе без супыну... І першыя вынікі ўжо ёсць: яшчэ не так даўно мы бачылі там брудную руіну, цяпер жа — уражанні зусім іншыя. Не пабыўшы ў Косаве хаця б год, абавязкова адчуеш розніцу, асабліва калі трапіць у інтэр'еры, спусціцца ў сутарэнні. Адразу пераконваешся, што там адраджаецца атмасфера даўніны.

— А ці ёсць новыя маштабныя задумы ў справе адраджэння спадчыны?

— Не так даўно распачаўся праект па аднаўленні сядзібы Дастаеўскіх у Іванаўскім раёне, актыўны ўдзел у якім возьме і расійскі бок, і бюджэт Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

— У адным са СМІ давялося чытаць, што мясцовая ініцыятыва тут — самая мінімальная...

— Мякка кажучы, гэта не зусім так. Не чакаючы, пакуль будзе сфарміраваны бюджэт Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, Брэсцкая вобласць выдаткавала са свайго бюджэту неабходныя сродкі, каб даць старт рэалізацыі праекта. Летась у Дастоеве адбыліся археалагічныя раскопкі — выяўлены падмуркі пабудоў маёнтка. Гэтыя работы былі неабходны для таго, каб архітэктары змаглі распачаць выраб праектнай дакументацыі.

Дарэчы, яшчэ некалькі цікавых задум датычыцца Брэсцкай крэпасці. У многіх яна асацыіруецца выключна з Цытадэллю. Але варта памятаць, што насамрэч тэрыторыя крэпасці куды большая. І таму ў паветры даўно лунае задума стварыць на яе плошчах прывабны для турыстаў гісторыка-культурны цэнтр. Ён будзе ўключаць і музей, і гатэльны комплекс, і гандлёвыя аб'екты...

Мы ўжо вялі перамовы на гэты конт з бельгійскімі інвестарамі і нават нібыта прыйшлі да паразумення, але… Як падаецца, справу спыніла нейкая нядобразычлівасць, што выпраменьваюць на адрас нашай краіны асобныя дзеячы пэўных структур Еўрасаюза. Але паколькі праект — папраўдзе перспектыўны, нам удалося зацікавіць ім расійскіх прадпрымальнікаў.

— Архітэктурная і гістарычная спадчына, жывыя традыцыі, некранутая прырода — Брэстчына мае мноства фактараў для развіцця свайго турыстычнага патэнцыялу. І, як сведчыць хаця б наплыў наведвальнікаў у тую ж крэпасць або Белавежскую пушчу, прагрэс тут — відавочны...

(Працяг на стар. 6)

Галоўная сустрэча ў рамках выязной рэдакцыі "К" з работнікамі культуры Брэстчыны адбылася ў камернай зале кобрынскага Палаца культуры — установы, што і вонкава, і па змесце цалкам адпавядае сваёй назве: сапраўдны палац!

Ідэі сяброў

Прывабны "дэкор" мае адпаведную "начынку" — прыкладам, уласную студыю гуказапісу з прафесійным абсталяваннем, якая дазваляе "захаваць для нашчадкаў" галасы цяперашніх зорак аматарскай творчасці...

Заканадаўчы "лікбез"

Гутарку на правах гаспадара распачала **начальнік аддзела культуры Кобрынскага райвыканкама Надзея ЖУК**. Падзякаваўшы "К" за разнастайныя і карысныя матэрыялы, яна тут жа адрасавала нам свае пажаданні:

— Заканадаўства ў сферы культуры змяняецца, а вось каментарыі да гэтых новаўвядзенняў удаецца знайсці не заўсёды. Я пераканана, што традыцыю "гарачых ліній" з юрыстамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь трэба адрадзіць.

Прыкладам, летась у жніўні былі прыняты папраўкі ў Закон аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Я шукала нейкія тлумачэнні гэтых інавацый — і не знайшла. Хаця, лішне казаць, тэма вельмі для нас актуальная, і таму, пераканана, падрабязнае тлумачэнне новых заканадаўчых нарматываў было б вельмі карыснае для ўсіх маіх калег. Увогуле, вельмі патрэбны тыя матэрыялы, што адлюстроўваюць цікавы досвед у гэтай галіне — да прыкладу, датычна распрацоўкі праектаў ахоўных зон, з якімі пакуль ва ўсіх вялікая праблема. Ніколі не будуць лішнімі і канкрэтныя метадычныя напрацоўкі…

Тэму юрыспрудэнцыі ў галіне прадоўжыла і **начальнік аддзела культасветустаноў упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Таццяна ШЧАРБУК**:

— Для многіх работнікаў культуры, асабліва з сельскай мясцовасці, газета становіцца галоўнай крыніцай папаўнення ўласнага досведу — не толькі ў плане творчых ды прафесійных навыкаў, але таксама і ў юрыдычнай сферы. Не ў кожнага з іх ёсць выхад у Інтэрнэт, ды і ў Сеціве не заўсёды знойдзеш тое, што патрэбна. І таму калі сустракаешся з клубнымі ды бібліятэчнымі работнікамі, нярэдка выяўляецца, што яны нават і не ведаюць пра нейкія важныя заканадаўчыя змены, якія непасрэдна датычацца іхняй дзейнасці. Чакаю і працяг конкурсу на лепшы сцэнарый. Добра было б, каб ён стаў рэгулярным…

(Працяг матэрыялаў з сустрэчы — на стар. 7)

Пад час сустрэчы ўдзельнікаў выязной рэдакцыі з работнікамі культуры Брэстчыны ў Кобрыне.

Старшыня Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Канстанцін СУМАР:

"Стратэгія эфектыўнасці і эканомікі, і культуры: па-гаспадарску ставіцца да рэсурсаў на карысць сучаснікаў ды нашчадкаў"

Што на Брэстчыне дарагога каштуе, або "Калі чалавек нешта мае за душой, гэта не трэба хаваць"

Канстанцін Сумар: "Ізноў жа, творчыя вынікі залежаць не толькі ад укладанняў, але, перадусім, ад людзей. Тым больш, работнік культуры — гэта не проста прафесія, якую можна асвоіць, атрымаўшы пэўную адукацыю. Гэта асаблівы ўзровень духоўнасці і стан душы. На шчасце, на Брэстчыне не бракуе яркіх асоб, якія спалучаюць сваю кваліфікаванасць са шчырым энтузіязмам".

(Працяг. Пачатак на стар. 5)

— Больш за тое: пра гэта сведчаць і статыстычныя даныя. Нам ужо, фактычна, удалося зраўняць аб'ёмы экспарту ды імпарту турпаслуг, а гэта дарагога каштуе! Шмат станоўчых зрухаў прынесла і развіццё аграэкатурызму. У вобласці працуе каля 180 сядзіб, і сярод іх наведвальнікаў нямала замежнікаў.

— Тым не менш, як падаецца, мяжа росту пакуль тут яшчэ не дасягнута. У прыватнасці, гэта датычыцца транспамежных маршрутаў. Ці робіцца на іх акцэнт у развіцці турызму на Брэстчыне?

— Натуральна, мы ж — памежны рэгіён! Таму дадзенае супрацоўніцтва для нас вельмі выгаднае, і не толькі ў эканамічным аспекце. Неаспрэчна, транспамежныя праекты спрыяюць папулярызацыі беларускай культуры, фарміраванню станоўчага іміджа нашай дзяржавы.

Зрэшты, мы павінны разумець, што тыя ж праекты па адраджэнні спадчыны разлічаны не толькі на турыстаў. Тут вельмі важны і выхаваўчы аспект. І калі маладое пакаленне не будзе ведаць гісторыю сваіх родных мясцін, калі з маленства яму не будзе прывіта пашана да гістарычных каштоўнасцей, дзе гарантыя, што яно з беражлівасцю паставіцца да нашых набыткаў, што адноўленыя помнікі не будуць ізноў страчаны?

— Сёння многія задаюцца пытаннем: як "дастукацца" да моладзі"? У тым ліку — сродкамі культуры...

— Колькі мы ні будзем казаць "халва", у роце саладзей не стане. Наша моладзь цудоўна гэта разумее і на адны толькі лозунгі не "вядзецца". Таму я прызвычаены весці з ёю шчырую гутарку. Не трэба запэўніваць у тым, што ў нас тут — рай на зямлі, або баяцца закранаць злабадзённыя праблемы. Але пры гэтым мы павінны казаць: дык давайце вырашаць іх разам! Я заўсёды падкрэсліваю: зразумейце, калі мы сыдзем, вы ж прыйдзяце нам на змену і будзеце кіраваць нашай краінай.

І самае важнае — каб словы не разыходзілся са справай. Сваёй працай трэба рабіць усё магчымае, каб наша краіна была камфортнай для жыцця. Тады нікога з замежнікаў і пераконваць ні ў чым не давядзецца. Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Я даўно заўважыў, што тая палітыка, якую праводзіць Прэзідэнт нашай дзяржавы, за апошняе дзесяцігоддзе вельмі паўплывала на маладых людзей, літаральна перавярнула іх свядомасць. Яны бачаць, што ў сябе на Радзіме можна атрымаць усё патрэбнае для нармальнага жыцця: і адукацыю, і працу, і бясплатнае лячэнне, і магчымасць сябе рэалізаваць — на сцэне, у спортзале ці дзе яшчэ. Таму сёння, паводле маіх назіранняў, абсалютная большасць маладых людзей шчыра адданая сваёй зямлі. Астатнія — гэта альбо тыя, каго ўвогуле нічым пераканаць немагчыма, альбо людзі несвядомыя ды хісткія, падуладныя розным эмоцыям ды павевам. Іх таксама не выпадае лічыць згубленымі: мабыць, яшчэ адумаюцца. Прыйдзе час — і само жыццё пераканае...

— Прыязджаючы на Брэстчыну, мы кожны раз упэўніваемся ў тым, што развіццё галіны культуры вобласці — вельмі дынамічнае. Спазнаўшы грунтоўную рэканструкцыю, многія ўстановы літаральна нараджаюцца наноў, выяўляючы высокія стандарты XXI стагоддзя. І гэта сапраўды ўражвае...

— З уласнага досведу магу запэўніць, што кожны дзень, які вы праведзяце на Брэстчыне, прынясе вам новыя станоўчыя ўражанні! І больш за ўсё ўражваюць нават не прыгожыя фасады ды і ўтульныя залы ўстаноў культуры, а менавіта тыя людзі, дзякуючы руплівасці якіх адбыліся гэтыя станоўчыя змены. Адных толькі грашовых сродкаў было б замала, каб вырашыць набалелыя праблемы паляпшэння матэрыяльнай базы: сродкі ж яшчэ трэба дбайна і з розумам асвоіць! І менавіта дзякуючы кіраўнікам розных узроўняў, якія ўкладаюць у аднаўленне ды далейшае жыццё аб'ектаў культуры нават не проста свае сілы і час, а папраўдзе часцінку сваёй душы, наша сацыяльная сфера няўхільна развіваецца.

— Тым не менш, без фінансавых укладанняў чакаць якасных зрухаў таксама наўрад ці выпадае...

— Безумоўна! Летась на рамонт і рэканструкцыю ўстаноў культуры было выдаткавана трохі менш сродкаў, чым раней. Але гэта абумоўлена адной простай прычынай: мы вельмі шмат зрабілі ў мінулыя гады. Дзякуючы Дзяржаўнай праграме адраджэння і развіцця сяла, усе асноўныя праблемы галіны былі вырашаны. Сямтам мы проста прывялі ўстановы культуры ў парадак, у многіх выпадках спатрэбілася грунтоўная рэканструкцыя, а дзе-нідзе — нават і новае будаўніцтва. Сродкаў было ўкладзена папраўдзе вельмі шмат, затое сёння літаральна ў кожным аграгарадку ёсць прыстойны Цэнтр культуры, прычым многія з іх нічым не саступаюць нават гарадскім. Таму, не крывячы душою, магу сказаць: у вобласці мы стварылі належную матэрыяльную глебу для "творчых парасткаў" яе жыхароў.

— Ці апраўдваюць сябе гэтыя інвестыцыі? Ці паспрыялі яны якаснаму зруху ў рабоце галіны культуры?

— Ізноў жа, творчыя вынікі залежаць не толькі ад укладанняў, але, перадусім, ад людзей. Тым больш, работнік культуры — гэта не проста прафесія, якую можна асвоіць, атрымаўшы пэўную адукацыю. Гэта асаблівы ўзровень духоўнасці і стан душы. На шчасце, на Брэстчыне не бракуе яркіх асоб, якія спалучаюць сваю кваліфікаванасць са шчырым энтузіязмам. Паглядзіце, колькі ў нас цудоўных калектываў, што актыўна гастралююць і ў краіне, і за мяжой, становяцца лаўрэатамі міжнародных конкурсаў! Тое ж датычыцца і музейшчыкаў, і бібліятэкараў...

Даўно пераканаўся, што творчы дух нашым работнікам культуры пазычаць няма патрэбы. А вось што да матэрыяльнага аспекту іх жыцця... Цяжка не пагадзіцца з тым, што ён пакуль пакідае жадаць лепшага, — і, думаю, не толькі ў нас на Брэстчыне. Так, мы прызвычаіліся казаць пра культуру ўзнёслым тонам, але ж нельга забываць і пра надзённыя праблемы тых людзей, якія ў ёй працуюць: скажам, пра памеры іх акладаў. Апошнім часам пэўныя зрухі тут назіраюцца, але трэба ў гэтым накірунку працаваць і надалей.

— Працэс аптымізацыі сельскіх устаноў культуры, што адбываецца цяпер ва ўсёй краіне, выклікае неадназначную рэакцыю. Безумоўна, і грошы ашчаджаць трэба, але ж і пра сацыяльны складнік нельга забываць...

— Вы абсалютна маеце рацыю! Больш за тое: сацыяльны, выхаваўчы складнік тут павінен быць на першым месцы. Што да аптымізацыі... Тут агульнага "рэцэпта" быць не можа: кожны выпадак патрабуе індывідуальнага разгляду. Бывае, у невялічкай вёсцы ёсць дзве бібліятэкі: грамадская (агулам у нашых вёсках іх 622) і школьная. Здавалася б, і там, і там чытачоў небагата, адлегласць паміж установамі — сотня метраў... Дык чаму б іх не аб'яднаць? Ніякай шкоды для справы тут не будзе, а выдаткі — значна скароцяцца.

Увогуле, я лічу, што будучыня — менавіта за буйнымі і сучаснымі ўстановамі культуры, здатнымі даць карыстальнікам самы шырокі спектр магчымасцяў. У маленькіх клубах асартымент, як правіла, зусім невялікі, і патрабавальнага вяскоўца ён ужо не задавальняе. Іншая справа — калі ў цябе ёсць права выбару. Хочаш — харэаграфія, хочаш — харавыя спевы... Любыя магчымасці выявіць і развіць свой талент! А талентаў у нас — мноства, галоўнае — прыгледзецца...

— Цяжка не пагадзіцца, але ж сёння немінуча ўзнікае пытанне: як дапамагчы таленавітым артыстам "з народу" выявіць усё, на што яны здатны? Асабліва гэта тычыцца менавіта рэгіянальных калектываў: не так і часта іх убачыш на вялікіх пляцоўках...

— Мы ўжо вынайшлі даволі эфектыўную методыку. Мабыць, у кожным раёне час ад часу праходзяць буйныя мерапрыемствы абласнога ўзроўню, і неад'емным складнікам большасці з іх з'яўляецца ўрачысты канцэрт. Раней на такія імпрэзы сцягваліся творчыя сілы, не раўнуючы, з усёй Брэстчыны. Цяпер жа мы прымяняем іншую тактыку: даручаем правесці канцэрт сіламі самога раёна. І гэта вельмі стымулюе творчую актыўнасць "на месцах", спараджае своеасаблівую канструктыўную канкурэнцыю. Кожны ж прагне "не ўдарыць лицом в грязь" перад сваімі калегамі з суседніх раёнаў!

— Наколькі вядома, вы таксама выходзілі на сцэну ў якасці спевака. Ды і дыск у вас выйшаў некалькі гадоў таму. Ці не боязна мець такое "нестандартнае" для высокай пасады хобі?

— Я заўсёды прытрымліваўся наступнага прынцыпу: калі чалавек нешта мае за душой, гэтага не трэба хаваць. А ў працы маё хобі толькі дапамагае. Паверце, такім чынам бывае куды прасцей дастукацца да сэрцаў людзей, чым любымі афіцыйнымі прамовамі...

Пытанні задавалі ўдзельнікі выязной рэдакцыі "К"
Фота Юрыя ІВАНОВА

Ідэі сяброў

Танцы вакол праблемы

(Працяг. Пачатак на стар. 5)

Начальнік аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама Уладзімір ШЭЛЯГОВІЧ мае вялікі аўтарытэт сярод калег. І не толькі "па старшынстве" — хаця сваю пасаду ён займае цягам вось ужо чатырох дзясяткаў гадоў, рэалізаваўшы за гэты час не адзін унікальны паводле свайго маштабу ды навізны праект, — але і таму, што Уладзімір Васільевіч заўсёды вызначаўся сваёй шчырай ды прынцыповай пазіцыяй.

Пад час сустрэчы з супрацоўнікамі рэдакцыі "К" ён закрануў папраўдзе набалелую для ўсіх работнікаў культуры тэму дыскатэк, якую мы неаднойчы ўзнімалі, тлумачачы канкрэтнае вырашэнне пытання. І тым не менш…

— Абмежаваўшы час правядзення дыскатэк для непаўнагадовых, мы літаральна разагналі моладзь, — адзначыў Уладзімір Шэляговіч. — Мы ж з вамі і самі, як былі крыху маладзейшыя, кожныя выхадныя рушылі ў клуб на танцы. А сёння ў нас як? Хлапчыну выганяюць з Дома культуры акурат а дзясятай вечара, бо яму яшчэ няма васямнаццаці... І ўжо ў 22.05 яго можна ўбачыць недзе на задворках, з пляшкай піва ды цыгарэтай у зубах! Унутры ўстановы культуры мы маем магчымасць выхоўваць і, урэшце, уладу забараніць. І, ведаеце, спраўляемся! Не так даўно нашы дыскатэкі інспектавалі досыць высокія міліцэйскія чыны са сталіцы, і, прызнацца, апошнія былі нават здзіўлены тым, што дзесьці на "перыферыі" створаны такі высокі ўзровень маладзёжнай культуры.

Але хлопец, які п'е піва непадалёк ад ДК, — ужо па-за нашай кампетэнцыяй. Мы тут бездапаможныя. І ва ўсім гэтым ёсць прыкрая, балючая непаслядоўнасць: удзень мы цугам валачом моладзь у нашы сцены, каб перадаць ёй нейкі пазітыўны пасыл, але надыходзіць вечар — і эфект нашай працы рассейваецца, бы туман. Мы пад корань рэжам тое, што самі робім…

З Уладзімірам Васільевічам салідарызаваўся і яшчэ адзін карыфей культурнай сферы Брэстчыны — **начальнік аддзела культуры Столінскага райвыканкама Васіль ЗАРУБА**:

— За савецкім часам клубныя ўстановы сістэмы культуры не мелі канкурэнтаў — на вёсках яны былі адзінымі месцамі зносін. Сёння сітуацыя змянілася: з'явіліся прыватныя месцы адпачынку, прычым не толькі ў буйных гарадах. Так, наш раён лічыцца сельскім, але ж вёскі на Століншчыне — даволі вялікія, таму гэтая тэндэнцыя нас не абмінула. Нягледзячы на ўсе праблемы з матэрыяльнай базай, яшчэ не так даўно нашы клубнікі маглі прываблівацьпадлеткаў сваімі цікавымі ды крэатыўнымі задумамі, але ў цяперашняй сітуацыі ў тынэйджараў папросту няма выбару. Мы іх увечары вымушаны не пускаць, а вось "дзверы насупраць" адкрыты заўсёды, і пашпарт там ніхто не спытае…

Безумоўна, адпачынак моладзі часам спараджае вельмі сур'ёзныя эксцэсы, але... Перакананы, што іх можа прадухіліць толькі ўзважаная ды скаардынаваная дзейнасць усіх зацікаўленых ведамстваў. А рабіць тут "крайнімі" работнікаў культуры — гэта не зусім шчыра і, канешне ж, проста непрадуктыўна.

Уладзімір Шэляговіч таксама перакананы, што праблемы бяспекі ды правапарадку неабходна вырашаць разам — на міжведамасным узроўні.

— У нас — шквал даручэнняў з сілавых структур, і праводзячы масавае мерапрыемства, культработнік павінен дбаць пра турнікеты, бяспеку, нават пра рух транспарту на прылеглай тэрыторыі. А іншыя — толькі кантралююць. Прыкладам, актывісты БРСМ у нас робяць рэйды па дыскатэках, выяўляюць недахопы. Але ж іх функцыя мне ўяўляецца зусім іншай: яны маюць быць арганізатарамі, а не інспектарамі, павінны праводзіць гэтыя імпрэзы поруч з работнікамі культуры!

Начальнік жа аддзела культуры Ляхавіцкага райвыканкама Ніна ПРЫХАЧ канстатавала:

— Пасля прыняцця згаданай ужо пастановы Савета Міністраў злачыннасць сярод непаўнагадовых павялічылася, прычым істотна, — гэта статыстыка па нашым раёне…

(Заканчэнне на стар. 9)

Пад час сустрэчы ўдзельнікаў выязной рэдакцыі з работнікамі культуры Брэстчыны ў Кобрыне.

Сяргей ПАНАСЮК стаў начальнікам упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама адносна нядаўна. Аднак справу ведае да драбніц, бо доўгі час кіраваў аддзелам культуры Брэсцкага райвыканкама. Кіраўніцтва вобласці абрала бяспройгрышны кадравы варыянт: менеджар, які на раёне паказваў неблагую аддачу, і на ўзроўні рэгіёна не падвядзе.

Практыка пераконвала: начальнік з вопытам працы на месцах — больш самастойны, распарадлівы. А Сяргей Панасюк паспеў папрацаваць яшчэ і намеснікам дырэктара Брэсцкага цэнтра пазашкольнай работы. Музыкант па адукацыі, ён актыўна падтрымліваў усе маладзёжныя ініцыятывы, якія таксама ішлі "знізу". Так у рэгіёне з'явіліся нефармальныя фестывалі альтэрнатыўнай музыкі. Інакш кажучы, крэатыўшчык крэатыўшчыка заўжды зразумее...

Крэда і тэхналогія начальніка ўпраўлення

— Хоць і інструментаў якасных тады не хапала, — распавядае Сяргей Барысавіч, — але галаканцэрты, што ладзіліся ў рок-барах, збіралі ўвесь Брэст. Дзесяць гадоў прайшло, цяпер у кожнай рок-каманды — вельмі прыстойныя інструменты...

— У Кобрынскім палацы культуры нам паказвалі студыю гуказапісу. Апаратура і інструменты — таксама самыя сучасныя. Дый сам Палац — шыкоўны. Але гэта буйны раённы цэнтр. Вёска ў дадзеным плане яўна адстае... У якасці начальніка ўпраўлення, якой вам бачыцца будучыня сельскай моладзі?

— Цяпер у кожным сельсавеце ёсць аграгарадок. Ад любой вёскі да яго — да дзесяці-дванаццаці кіламетраў. Кожнае буйное эстраднае ці фальклорнае мерапрыемства ладзім па "кустах", у звязцы — два-тры раёны. Збіраецца журы. Падключаюцца, натуральна, школы мастацтваў. Ідзе пастаянны адбор юных талентаў. Іх вельмі шмат. Праца з такой моладдзю — адзін з галоўных кірункаў нашай дзейнасці... Вы казалі пра кобрынскую студыю гуказапісу — такія і ў раёнах павінны быць. Без якаснай фанаграмы — якое развіццё для маладых спевакоў? Але дасведчаных гукааператараў — адзінкі. І гэта — праблема...

— Гукастудыя ёсць у Баранавічах...

— Так, але мы цяпер абсталёўваем аналагічную студыю абласной філармоніі. Яна будзе самай сучаснай у тэхнічным плане.

— Ведаю, пэўныя паслугі такіх студый — платныя. Ваша стаўленне да развіцця пазабюджэтнай дзейнасці, у тым ліку і на сяле.

— Планы па аказанні платных культурных паслуг мы выконваем. Але галоўнае — духоўнасць.

— "К" пра гэта піша. Стаў творчы калектыў народным ці ўзорным, абараніў званне, увёў стаўку мастацкага кіраўніка — і адразу ж план камерцыйнай дзенасці...

— Не забыцца б пры гэтым, што адзін з выканаўцаў такога калектыву дзень у полі працаваў, другі прыйшоў з заводскай змены, а трэці — урач ці настаўнік…

— Гаворка — пра "залатую сярэдзіну", пра той мінімум пазабюджэту, без якога ўстанова не зможа адчуць сябе больш-менш самастойнай у выбары сваёй "тэхнічнай" будучыні…

— Усё залежыць ад распарадчасці кіраўніка той установы. Калі ён зацікаўлены ў развіцці, дык будзе зарабляць на энергазберагальныя лямпачкі, на сучасную апаратуру... І — без шкоды для творчасці. Такой пастаноўцы спраў можна павучыцца ва Украіне, у Польшчы. Там ладзяцца платныя канцэрты на прадпрыемствах…

— У сельскіх бібліятэках камп'ютары збольшага ёсць, а ў клубах?

— Безумоўна, упраўленне ўсяляк да гэтага імкнецца. Але выкананне намечанага залежыць і ад мясцовых улад. Калі старшыня райвыканкама пазначае ў сваім фінансавым патоку грошы для развіцця сельскай культуры, дык там і праблем няма з набыццём клубных ноўтбукаў. Безумоўна, той-сёй з датацыйных раёнаў адстае ў гэтым плане. Там, дзе хапае вытворчых прадпрыемстваў, справы рухаюцца хутчэй.

— А вы можаце папракнуць пэўных начальнікаў аддзелаў культуры ў адсутнасці аўтарскіх праектаў, увогуле, — у безініцыятыўнасці?

— Я добра ведаю кола абавязкаў начальніка аддзела культуры: з гэтай сферы прыйшоў і ведаю дэталёва яе знутры... Пасіўны ў творча-вытворчых пытаннях начальнік можа пратрымацца на пасадзе месяц-два. Без учэпістасці ды крэатыўнасці цяпер не абысціся…

— Але ж не ўсе такія актыўныя, як, скажам, Надзея Жук з Кобрына, Уладзімір Шэляговіч з Іванава ці Васіль Заруба са Століна…

— Ну дык не ўсе ж аддзелы вобласці знаходзяцца ў роўных умовах…

— Маю на ўвазе не эканоміку раёнаў, а шматстайнасць творчага праектавання, яркую рэалізацыю нестандартных ідэй…

— Жабінкаўскі раён "паставіў" спевака на дзіцячае Еўрабачанне. Лунінецкі — "засвяціўся" з вакалістам на АНТ. Гэта вынік планамернай работы і ўпраўлення, і абласнога Грамадска-культурнага цэнтра... Так, гэта планамерная дзейнасць па падтрымцы таленавітай моладзі. Але і іншыя праекты не менш выніковыя. У Іванаўскім раёне 22 працэнты школьнікаў навучаецца ў школах мастацтваў — самы высокі паказчык на Брэстчыне... Шмат цікавага знойдзеце ў Івацэвіцкім, Камянецкім, Пружанскім, Драгічынскім, Ляхавіцкім раёнах…

— Цікавага сапраўды шмат. Як, зрэшты, і ў сферы прафесійнага мастацтва. А чаму вашы брэсцкія Акадэмічны тэатр драмы з яго цудоўнымі спектаклямі, Тэатр лялек са шматлікімі замежнымі перамогамі, самабытны Палескі драмтэатр так рэдка гастралююць па Беларусі, у тым ліку і ў Мінску?

— З аднаго боку, гастролямі нашы тэатры не пакрыўджаны: мяжа — побач. З іншага ж, у Мінску пры гэтым яны бываюць рэдка… Папрок на адрас і адміністратараў, і піяр-менеджараў. Але ў нас невялікая краіна, каб выязджаць штогод на гастролі ў сталіцу. Ды і непаўторных таленавітых тэатраў вельмі шмат... Тым не менш, я ўлічу вашу заўвагу ў сваёй далейшай дзейнасці.

— Пабачыўшы Абласны краязнаўчы музей, мы зрабілі адназначную выснову: у сталіцы такіх шыкоўных устаноў пакуль няма…

— Даўно кажу: аб'екты культуры могуць прыцягнуць патрабавальных наведвальнікаў толькі крэатыўнасцю. Але і без належнай рэкламы не абысціся. Разам з кіраўніком музея Аляксеем Міцюковым запрасілі начальнікаў аддзелаў адукацыі (а гэта дванаццаць раёнаў, тры буйныя гарады), правялі бясплатную экскурсію, раздалі буклеты. У музеі ці не кожны клас пабываў. Павучыўся тут крэатыўнасці і кожны начальнік аддзела…

— Дырэктар музея даплачвае сваім супрацоўнікам за арыгінальныя ідэі ды іх рэалізацыю. Ці стала гэта нормай у аддзелах?

— Ну, вось такі наш менталітэт: іншым разам і за руку трэба весці... Калі жадаеш дабіцца поспеху — бяры сцяг, ідзі ў народ, даказвай і пераконвай асабістым прыкладам!.. Але, пагадзіцеся, людзі ў культуры працуюць, па сутнасці, без выхадных далёка не за заробак…

Пытанні задаваў Яўген РАГІН

Рэзюмэ "К" у дарозе

Пытаемся на завяршэнне сустрэчы:

— Тым не менш, Сяргей Барысавіч, у чым "тэхналогія" творчага поспеху?

— Кожны на сваім месцы павінен быць прафесіяналам, — адказаў нам суразмоўца.

Ідэі сяброў

АптыміЗАцыя?Ці ўсё ж — супраць?

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5, 7)

Пад час сустрэчы абмяркоўвалася і іншая надзённая справа — аптымізацыя ўстаноў культуры. У прыватнасці, яна датычыцца аб'ядання школьных і грамадскіх бібліятэк у тых вёсках, дзе для гэтага наспела патрэба. Як адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Тамара ПАЎЛЮКОВІЧ**, агульная тэхналогія гэтых працэсаў пакуль яшчэ не выпрацавана, хаця, здавалася б, ужо і асобная калегія праведзена разам з абласным упраўленнем адукацыі. Але справа, што ні кажы, дужа датклівая, і тут варта сем разоў адмераць...

Супраць бяздумнай ліквідацыі сельскіх устаноў культуры ва ўгоду выключна эканоміі выказаўся і Уладзімір ШЭЛЯГОВІЧ:

— Клуб — гэта цэнтр вясковага жыцця, тое месца, дзе людзі збіраюцца пад час нейкай важнай грамадскай ініцыятывы, прыкладам, выбараў або сходаў. А калі яго закрыць, дык і сабрацца ўжо няма дзе. І менавіта таму людзі плачуць, калі закрываюцца клубы! Вы думаце, я ўтрырую? Ды зусім не! На ўласныя вочы бачыў слёзы на вачах мужчыны сталага веку. Ён казаў слушную рэч: калі краму ў нас зачынілі — гэта яшчэ нічога, а вось калі зніклі клуб, школа — значыць, і вёсцы ўжо падпісаны смяротны прысуд… І тут жа ўзгадвае, як у ягонай маладосці вёска была вясёлай ды шматлюднай...

Я разумею, што на змену стацыянарным клубам прыходзяць мабільныя ўстановы культуры. Але два прыезды на месяц — гэта ўсё ж не тое! Таму я любымі сіламі падтрымліваў бы тыя агмяні культуры, што яшчэ тлеюць у нашых вёсках. Тым больш, сельскі клубік ці бібліятэка не патрабуе шмат грошай для ўтрымання. Няхай бы там застаўся толькі адзін спецыяліст, няхай нават адно на палову стаўкі, але ж у вяскоўцаў заўсёды было б тое месца, куды яны могуць зайсці. Бо ўжо цяпер у мяне часам той-сёй пытаецца: маўляў, чаму гэта мае дзеці павінны наведваць установу культуры за пятнаццаць кіламетраў ад дома?..

Тамара Паўлюковіч закранула і іншы аспект аптымізацыі — юрыдычны:

— Яшчэ параўнальна нядаўна мы надавалі школам мастацтваў статус юрыдычных асоб, і вось, зусім нядаўна, — новыя павевы: такі варыянт лічыцца немэтазгодным, а замест яго — ідэя пакінуць адну школу ў раёне ў якасці юрасобы, а ўсе астатнія зрабіць яе філіяламі. І акурат гэтая ідэя мне падаецца немэтазгоднай! Возьмем, да прыкладу, Столінскі раён, дзе адлегласці паміж школай і яе філіялам могуць дасягаць васьмідзесяці кіламетраў! Як у такіх варунках не згубіць сістэму кіравання?..

Надзея Жук звярнула ўвагу і на яшчэ адзін нарматыўны акт, які хвалюе многіх работнікаў культуры: пастанову Міністэрства фінансаў № 152, паводле якой установы культуры павінны кампенсаваць за кошт пазабюджэтных фондкаў затраты на камунальныя паслугі. Безумоўна, у некаторых сельскіх клубах яны ледзь не перавышаюць тыя сціплыя сумы, што атрымліваецца зарабіць работніку культуры. А на мадэрнізацыю абсталявання і стымуляванне працы ўжо нічога не застаецца.

— Газета — наш саюзнік у вырашэнні тых праблем, якія ў нас наспелі, — падзяліўся думкай Васіль Заруба. — І калі мы выносім набалелае на старонкі рэспубліканскай прэсы, дык спадзяёмся на планамернае ды канструктыўнае вырашэнне згаданых пра-

Рэзюмэ "К" у дарозе

Па выніках нашай сустрэчы лёгка прыйсці да высновы, што работнікаў культуры Брэстчыны хвалюе перадусім менавіта юрыдычны аспект рэгіянальнай культуры і, асабліва, тыя нарматыўныя акты, якія яны лічаць не вельмі "адаптаванымі" да канкрэтных рэалій нашага жыцця.

Зрэшты, закон — не догма, яго можна змяніць легітымным шляхам. І менавіта таму такія абмеркаванні зусім не пазбаўлены сэнсу.

Пад час сустрэчы ўдзельнікаў выязной рэдакцыі з работнікамі культуры Брэстчыны ў Кобрыне.

Аглядаючы вартыя жалю руіны, якіх, па волі гісторыі, у нашай краіне не бракуе, многія шчыра перакананы, што лёс апошніх адназначна фатальны і ніколі ўжо ў пашчэрбленыя муры не вернецца жыццё. Колішняя рэзідэнцыя Сапегаў у Ружанах адпрэчвае гэты стэрэатып і дадае аптымізму.

Яшчэ гады тры таму шыкоўны некалі комплекс насялялі адно козы ды іншая жыўнасць. Яшчэ летась адноўлены і пакрыты бялюткай тынкоўкай правы флігель выразна кантраставаў са "шкілетам" свайго гаротнага левага сабрата. Сёння ж абодва яны выглядаюць аднолькава эфектна і прымаюць наведвальнікаў.

Уязная брама ў палац Сапегаў цяпер сапраўды стала брэндам Ружанаў.

Магніт Сапегаў і... магніцікі

У экспазіцыі музея не так і шмат рарытэтаў. Як-ніяк, усе скарбы Сапегаў былі вывезены за межы Беларусі задоўга да нашага часу. Але прадуманая і візуальна выразная экспазіцыя пакідае самыя лепшыя ўражанні, асабліва — у спалучэнні з экскурсіяй. Ды і адрэстаўраваныя флігелі разам з брамай не выглядаюць навадзелам: нібыта так яно ўсё і было...

Як адзначыў галоўны спецыяліст упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Вячаслаў Гарбузаў, пад час рэстаўрацыі гістарычныя руіны не пацярпелі: іх удалося захаваць, нягледзячы на кепскі тэхнічны стан. Натуральна, пад час работ выкарыстоўвалася адмысловая цэгла, зробленая, між іншым, непадалёк адсюль, на Століншчыне. А непасрэдна ў час рэстаўрацыі выявіліся і сапраўдныя цікавосткі — скажам, падлога з той сядзібы, што яшчэ папярэднічала цяперашняй.

Вядома, тут адразу ўзнікае пытанне: а што далей? Тым больш, ставіць кропку ў гэтым месцы неяк не лагічна: адрэстаўравана ж пакуль толькі частка ацалелых пабудоў, а астатнія — у руінах.

Дырэктар музея Руслан Кніга.

Варта таксама дадаць, што гэтыя работы збольшага выкананы менавіта за кошт раённага бюджэту. Шмат было размоў пра ўключэнне дадзенага аб'екта ў Рэспубліканскую інвестыцыйную праграму, але...

— Пытанне, на жаль, пакуль не вырашана, — распавёў начальнік аддзела культуры Пружанскага райвыканкама Канстанцін Панімаш. — Але, нягледзячы на ўсе цяжкасці, будзем рухацца далей. На бягучы год раёнам на працяг рэстаўрацыйных работ выдаткаваны 1 мільярд 200 мільёнаў рублёў. Так што неўзабаве прыступім да аднаўлення сапегаўскага тэатра — праектная дакументацыя ўжо рыхтуецца. Вядома, сродкі — невялікія, але...

— Самае галоўнае, што аднаўленню быў дадзены старт, што ўжо і сёння актыўна едуць людзі, — падхапіў Вячаслаў Гарбузаў.

І сапраўды, "нованароджаны" музей адразу стаў карыстацца попытам сярод турыстаў. Летась іх было больш за 18 тысяч. І многія, трэба меркаваць, з'ехалі адсюль не з пустымі рукамі. Дырэктар установы Руслан Кніга дэманструе кубкі, магніцікі ды іншыя няхітрыя і недарагія сувеніры.

Напэўна, ні адно надвор'е так, як снежная сонечная зіма, не падыходзіць для наведвання такіх знакавых помнікаў, як Мемарыяльны музей Тадэвуша Касцюшкі і Палац Пуслоўскіх у Косаве. Яны сустракалі нас першымі ў нашым падарожжы, як і іх куратары: намеснік старшыні Івацэвіцкага раёна Аляксандр Вялікаселец ды дырэктар музейнай установы Ірына Анціпенка.

Мемарыяльны музей Тадэвуша Касцюшкі.

"Мы ажаніліся ў Касцюшкі"

Сёння сядзібны дом, у якім нарадзіўся нацыянальны герой Беларусі, Польшчы, ЗША і Ганаровы грамадзянін Францыі Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, уяўляе з сябе музейны комплекс з васьмі пакояў. Два з іх — адміністратыўныя, адзін — гістарычны, і мемарыяльная частка: сені, кухня, пакой маці, рабочы кабінет бацькі Касцюшкі і гасціная.

Ірына Станіславаўна правяла для нас невялічкую экскурсію, прадэманстраваўшы цікавыя экспанаты музея, і распавяла пра сучаснае жыццё гэтага невялічкага дамка.

— Калі музей адкрыўся ў 2004 годзе, а ён пабудаваны на тым самым фундаменце старажытнай сядзібы XVIII стагоддзя, — кажа яна, — працаваў толькі адзін пакой — гасціная. І шмат экспанатаў мы атрымалі ў дар ад людзей — жыхароў нашага краю, раёна, наведвальнікаў...

Бачна, што гэтая традыцыя працуе ў музеі і сёння. Прадметы мэблі ды посуд — ад землякоў, калекцыя здымкаў першага косаўскага фатографа — ад яго спадчыннікі з Лодзі, партрэт Тадэвуша Касцюшкі — ад мастака і калекцыянера з Баранавічаў, побач жа — стогадовая карціна з выявай героя ад дарыльшчыка з польскай вёсачкі, жывапіснае палатно ад губернатара Брэсцкай вобласці Канстанціна Сумара, падарункі ад амерыканскіх кадэтаў, 18-хвілінны фільм пра славутага дзеяча, створаны пры фінансавай падтрымцы UNESCO...

— Сёння ў нас ужо ёсць стужкі і на беларускай, і на польскай мовах, — адзначае дырэктар. — А вось асаблівую папулярнасць музей набыў, калі з 2009 года мы ўвялі новую паслугу, што дазваляе парам зарэгістраваць свой шлюб у нашай сядзібе. І на сёння ў нас ужо больш чым паўсотні сем'яў...

На будучыню музейная ўстанова плануе адкрыць выстаўку фатаграфій тых пар, што злучылі свае жыцці ў сядзібе.

— Каб праз дваццаць гадоў яны вярнуліся да нас і ўбачылі сябе — такіх прыгожых і маладых… — прапаноўвае дырэктар будучы варыянт сустрэчы.

Ды яшчэ цырымонія шлюбу мае ўдасканаліцца: сакратару Косаўскага гарвыканкама, які рэгіструе маладых, збіраюцца набыць нацыянальны строй.

— Вядома, самы запамінальны варыянт, — кажа Ірына Анціпенка, — калі малады "Касцюшка" вітае будучую сям'ю…

І можна пагадзіцца, што такое вяселле сапраўды не забудзецца!..

Камянец — Драгічын — Іванава

Думаць. І дзейнічаць!

І творчая, і архітэктурная дамінанта Камянца — сярэднявечная вежа. Менавіта вакол гэтай мураванай восі і закручваюцца асноўныя культурныя падзеі не толькі горада-раёна, а і вобласці. Тут прайшлі абласныя дажынкі, тут чатыры гады запар ладзілася рыцарскае свята...

Рэчка Лясная, як і ў XIII стагоддзі, узнімала хвалі ў такт ваярскіх атак... Цяпер, кажа начальнік мясцовага аддзела культуры Мікалай Громік, сярэднявечна-рыцарская эстафета нібыта аддадзена Міру, Навагрудку, Нясвіжу. Ля Камянца месца мала: і конніца лавай не пройдзе, і арбалетчык асабліва не разгуляецца. Але гэта не азначае, што колішні княжацкі фарпост, слаўны рамёствамі і вайсковай гісторыяй, згубіць для Брэстчыны "святаўтваральную" функцыю.

Шматгалосае сола ля старажытных муроў

Мастацкае аддзяленне Камянецкай ДШМ.

"Белая вежа" ў інтэрактыве

Намеснік начальніка ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Тамара Паўлюковіч загэўнівае, што Камянец без брэндавага свята, у тым ліку і абласнога маштабу, не застанецца. А Мікалай Громік дадае, што Камянецкая вежа як сімвал-антураж прысутнічае пры любой тэатралізацыі. Побач — сцэна, забрукаваная яшчэ да колішніх "Дажынак". Касцюміраваныя акцыі ды спектаклі на ёй будуць узноўлены і з нагоды тэтральнага фестывалю "Белая вежа". Як адзін з варыянтаў разглядаецца і арганізацыя ў ваколіцах рок-фестываляў. Прынамсі, Мікалай Громік, саксафаніст-эксперыментатар, такога выразнага "прывежавага" сола не выключае. Сёлета для такога пробнага мерапрыемства, пра якое даўно марыць начальнік упраўлення культуры, будзе задзейнічана і вежа, і гарадскі парк...

Камянецкая вежа, да ўсяго, — філіял Абласнога краязнаўчага музея. Загадчык мясцовай установы Таццяна Казулька распавядае, што з 2012-га ў вежы ёсць інтэрактыўныя паслугі. Сярод іх, да прыкладу, распрацавана музейная гульня-занятак для лучнікаў-аматараў "Трапны стралок". У бліжэйшых планах — інтэрактыўная экскурсія-віктарына "Вандроўка ў Сярэднявечча". Вежавая пяціяруснасць дазволіць зрабіць мерапрыемства інтрыгуючым. Калі ўлічыць, што за год філіял наведвае больш за 20 тысяч экскурсантаў, дык за выкананне плана пазабюджэтнай дзейнасці тут можна не хваляванца. Летась, да прыкладу, музейшчыкі зарабілі каля 80 мільёнаў.

Хтосьці з чытачоў запярэчыць: "Ну, у Камянцы вежа ёсць, вакол яе толькі лянотны не зафантануе ідэямі ды акцыямі... А нам што рабіць, калі ні помнікаў гістарычных, ні архітэктуры вытанчанай?" Адказ "К" напагатове: "Думаць трэба і дзейнічаць! Прычым неадкладна!" Калі няма міфа, яго трэба прыдумаць. Ці не так з'явіўся на Тураўшчыне легендарны цяпер крыж, што прарастае з зямлі?! І ці не ў кожным раёне Беларусі і па сёння жывая легенда пра падземныя хады, што злучалі колісь цэрквы, манастыры з нейкім таямнічымі выхадамі для колішніх інсургентаў ды авантурыстаў. А ў адным сельскім клубе "знайшлі" карту захавання панскага скарбу. І не бяды, што ў выніку дзіцячых "раскопак" ля ўстановы ўзніклі кветкавыя клумбы. Словам, дзейнічайце...

ДШМ размешчана побач з храмам.

Аб праектах філіяла "Камянецкая вежа" расказвае загадчык Таццяна Казулька.

Акорд за 12 мільёнаў

Паміж Камянецкай вежай і Свята-Сімяонаўскай царквой знаходзіцца дзіцячая школа мастацтваў, якой кіруе Мікалай Кранчынскі. Установа ўжо цягам чатырох гадоў дзейнічае ў рэканструяваным будынку. На аднаўленне яго выкарысталі паўтара мільярда рублёў. Па 16 спецыяльнасцях займаецца тут 270 юных музыкантаў і мастакоў — гэта маль 17 працэнтаў навучэнцаў агульнаадукацыйных школ. Філіял ДШМ — у вёсцы Пелішча. Вучыцца тут — прэстыжна. І не толькі таму, што дзеці пастаянна ўдзельнічаюць у міжнародных конкурсах ды прывозяць адтуль медалі.

Камянецкая ДШМ — своеасаблівы цэнтр культуры і мастацтваў у раённым маштабе. Такія ўстановы цяпер прынята называць мадэльнымі. І не варта пералічваць мясцовыя творчыя калектывы, іх — шмат, у тым ліку і духавы аркестр. Галоўнае, падаецца, не гэта, а тое, што начальнік аддзела з дырэктарам ДШМ — у неразрыўнай творчай звязцы. І кожны з іх — саліст, разам — спеўны дуэт, а ў маштабах раёна — не менш выразны хор. Памятаеце крэда Сяргея Панасюка: "Крэатыўшчык крэатыўшчыка заўжды зразумее"? А вось гэтаму ў іншых раёнах краіны варта і павучыцца.

У выніку тандэма ў ДШМ, па перакананні яе кіраўніка, проста не існуе праблем. Заробкі часам — больш за чатыры мільёны рублёў. Штогод абнаўляюцца музычныя інструменты. Апошні набытак — электрапіяніна коштам у 12 мільёнаў. Начальнік аддзела культуры перакананы: грошы неабходна ўкладваць найперш у перспектыўныя установы. А намеснік начальніка ўпраўлення культуры Тамара Паўлюкова дадае, што цягам бягучага года ў адпаведнасці з Дзяржпраграмай "Культура Беларусі" музычныя інструменты будуць аднаўляцца па ўсёй Брэстчыне...

Чарговы праект Камянецкай ДШМ — пярэбары мастакоў у асобны корпус, дзе запланавана і выставачная галерэя. Праект цалкам рэальны. Рэканструкцыя будынка ўжо вядзецца.

Яўген РАГІН

Рэзюмэ "К" у дарозе

Рухавік перабудовачнага працэсу — узаемаразуменне аддзела культуры і мясцовага кіраўніцтва, якое цудоўна разумее, што ДШМ ды музычныя школы (такіх устаноў на Камянеччыне — паўдзясятка, не лічачы філіялаў і класаў на сяле) — не толькі кузня будучых кадраў у сферы сельскай культуры, але і "прафесійных" спажыўцоў ды носьбітаў нацыянальнага мастацтва. Інакш кажучы — стабільны артыкул будучых не матэрыяльных, а маральных даходаў.

Каб зрабіць

Калі б гаворка ішла пра ўтварэнне пры аддзеле рэгіянальнай культуры "К" экспертнага савета з прафесіяналаў-практыкаў, дык узначаліў бы яго, напэўна, начальнік аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама Уладзімір Шэляговіч. І справа не толькі ў вялікім стажы. Гаворка — аб прыроджаным таленце кіраўніка ды ўменнях стварыць вакол сябе дзеяздольную каманду і самыя амбіцыйныя праекты ператварыць у

А праектаў гэтых — дастаткова, каб меркаваць ці не аб самым перадавым у рэспубліцы досведзе нестандартнага ўдасканалення сельскай культуры. І маем мы на ўвазе не толькі адмысловую Іванаўскую школу бондарства і амаль самаакупны фестываль "Мотальскія прысмакі", якім няма аналагаў у рэспубліцы. Хоць і іх было б дастаткова для канстатацыі таго, што мясцовы аддзел культуры — самадастатковы ды дзейнічае па ўласна распрацаванай стратэгіі.

У Красным Двары неўзабаве з'явіцца Дом-музей Напалеона Орды.

У долю ўступаюць прыватнікі

"К" пастаянна адсочвае сітуацыю з пераўтварэннем у музейны комплекс урочышча Красны Двор (паблізу Варацэвічаў), дзе знаходзіўся родавы маёнтак Напалеона Орды. Ад маёнтка, як вядома, застаўся толькі падмурак. А было больш як дваццаць збудаванняў на досыць значных адлегласцях. Цяпер тут ужо ўзведзены нясучыя сцены. Начальнік аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама распавядае: калі будынак Дома-музея будзе запушчаны, у долю адразу ўступяць прадпрымальнікі, гатовыя ўкласці грошы ў працяг і завяршэнне будаўнічых пераўтварэнняў. Пакуль усё робіцца за сродкі з мясцовага бюджэту: абласнога і раённага. І выдаткоўваюцца яны рэгулярна: летась — амаль мільярд рублёў, а сёлета ўжо паступіла ды закладзена ў каштарыс значна больш за мільярд рублёў. І дадзенае рэгулярнае ўкладанне цалкам апраўдана: на гэтых землях з'явіцца не толькі Музей Напалеона Орды, вядомага не толькі ў нас, але і ў Польшчы, Францыі. Мяркуецца ўзвядзенне буйнога турыстычнага комплексу з гасцініцай, рэстаранам, майстэрні па апрацоўцы дрэва.

У 2013-м, упэўнены Уладзімір Шэляговіч, будаўніцтва будзе завершана і распачнуцца аддзелачныя работы з наступнай падрыхтоўкай музейных экспазіцый. Немалая колькасць экспанатаў ужо ёсць. "Спадзяёмся, — кажа начальнік аддзела, — што родзічы Напалеона Орды, якіх мы адшукалі ў Францыі і запрасілі некалькі гадоў таму да сябе, нам таксама дапамогуць. Радуе і тое, што нашы, іванаўскія, землякі, якія ў свой час трапілі ў Парыж, нас таксама ўсяляк падтрымліваюць..."

Пасля наведвання Драгічынскага раёна мы пераканаліся: і тут дзейнічае каманда, скіраваная на канкрэтны вынік. І кожны раз ён мае сваю падаплёку — творчую ці гаспадарчую.

Начальнік аддзела культуры Драгічынскага райвыканкама Леанід Куроўскі лічыць такую "разгалінаванасць" цалкам заканамернай: не бывае ў сённяшняй культуры творцы, адарванага ад вырашэння праблем эканамічнага, фінансавага, тэхнічнага характару. Вось пра гэтую ўніверсальнасць драгічынскіх праектаў і хацелася б распавесці.

У Бездзеж, да Марыі Астаповіч...

Пра бездзежскі фартушок і аднайменны музей "К" пісала шмат. Але апошнім часам вясковая "мемарыяльная" гісторыя займела вельмі цікавы фінансава-турыстычны працяг. Па ініцыятыве начальніка аддзела культуры Леаніда Куроўскага ля Музея народнай творчасці ў Бездзежы з'явілася яго новая інтэрактыўная экспазіцыя: сялянскі падворак з назвай, што адлюстроўвае асаблівасць мясцовай гаворкі, — "Каля Плэса"...

Але спачатку мы пацікавіліся, наколькі цяжкім было ўтварэнне такой шматгаліновай структуры ў звычайнай вёсцы. Няма сумневаў, што тэхналогія паэтапнай рэалізацыі далёка не стандартнага праекта зацікавіць культурнікаў з іншых раёнаў іншых абласцей. Тэхналогія, на першы погляд, — нескладаная: выдумляй ды ажыццяўляй. Пра яе распавядае дырэктар музея ў Бездзежы Марыя Астаповіч: "У нашай вёсцы пуставаў будынак колішняй школкі, таму музей было вырашана адкрыць не ў райцэнтры, а ў Бездзежы, дзе ўжо існавала калекцыя ўнікальных

У штат музея "Бездзежскі фартушок" прыняты і майстрыхі.

Адзін раён — тры музеі!

У саміх Варацэвічах у 2006-м адкрылася карцінная галерэя. Менавіта тут знаходзіцца пакуль мемарыяльны пакой мастака і кампазітара, захоўваюцца літаграфіі, акварэлі, архіўныя дакументы... Дырэктар Раённага музейнага комплексу Напалеона Орды Дзмітрый Козак распавядае, што год таму было заключана партнёрскае пагадненне з польскім горадам Лосіцэ па стварэнні Цэнтра трансгранічных культур, гэта значыць, Дома-музея Напалеона Орды. Летась у кастрычніку камісія Еўрасаюза зацвердзіла іванаўскую заяўку на адпаведны грант, а гэта — без малога 300 тысяч еўра. Таму і не дзіва, што прыватнікі, якія заўжды трымаюць нос па ветры, даўно зразумелі: у раёне закручваюцца вялікія справы, што абяцаюць у перспектыве гэткія ж дывідэнды.

А калі да ўсяго названага дадаць яшчэ і тое, што кіраўніцтва Іванаўскага раёна ўсяляк паўплывала на тое, каб з'явіўся праект Саюзнай Дзяржавы па адраджэнні Дастоева, дык становіцца зразумела: мясцовы аддзел культуры працаваў, працуе і будзе працаваць у рэжыме павышанай напружанасці. І гэта для яго — норма. Вось вам і адказ на пытанне, як адшукаць за мяжой сваякоў знакамітага земляка, знайсці спонсараў, займець грант, і за кошт чаго працягваць будаўнічыя работы, удасканальваць ды пашыраць сетку ўстаноў культуры.

Што ў Кландайку?

Мяркуецца, што ў лютым Мотальскі музей народнай творчасці займее філіял — Музей археалогіі. Па меркаванні доктара археалогіі і аўтара канцэпцыі экспазіцыі Алены Калечыц, Мотальшчына для гісторыкаў — як Кландайк для золатакапальнікаў. Алена Генадзьеўна пераканалася ў тым на ўласным досведзе прафесійнага археолага. Музей яшчэ не адкрыўся, а ў фондах яго — каля ста тысяч ўнікальных экспанатаў, назапашаных у выніку шматлікіх раскопак у вясковым наваколлі. Так што пры такім начальніку аддзела, які ў далейшым культурным прасоўванні раёна ніколі свайго інтарэсу не ўпускаў, новая ўстанова проста не магла не ўзнікнуць...

У карціннай галерэі Варацэвічаў жыве дух Орды.

У многіх аддзелах скардзяцца: не стае дадатковых плошчаў для пашырэння культурнага ўплыву. У Моталі таксама не было, пакуль мясцовая АТС бязвыплатна не перадала мясцовым музейшчыкам адзін з паверхаў свайго службовага будынка. Безумоўна, усё само па сабе не адбылося. Але Шэляговіч у раёне — постаць аўтарытэтная, адмовіць яму — усё роўна што пагрэбаваць сацыяльнымі пераўтварэннямі. Словам, уменне пераконваць. Так і узнік Музей археалогіі. Трэці па ліку на Іванаўскай зямлі. А быў яшчэ Музей народнай медыцыны пры клубе ў вёсцы Стрэльна. У выніку аптымізацыі клуб скасавалі, а музей цяпер пераўтвараецца ў Дом траўніка… Я не буду пералічваць раёны Беларусі, дзе ўвогуле няма музеяў: дасведчаныя ў справе асобы пра гэта ведаюць цудоўна. Зазначу толькі адно: Шэляговіча на іх няма!

Музей археалогіі — інтэрактыўны. Тут усё можна будзе памацаць рукамі. Больш за тое: экспазіцыя складаецца так, каб у музейнай зале можна было зладзіць навучальны клас для заняткаў са школьнікамі. А пад час экскурсіі наведвальнікі займеюць шанц зрабіць па пячорных тэхналогіях, скажам, каменную сякеру!.. І, заўважце, усю гэтую раскошу прапануе гасцям не раённая, а сельская ўстанова. Для таго, каб яна ўзнікла, з раённага бюджэту выдаткавана 200 мільёнаў рублёў, з абласнога — 500 мільёнаў.

Стэнды будучага музея археалогіі.

Рэзюмэ "К" у дарозе

Наконт адсочвання вырашэння рэгіянальных праблем. Адзін з варыянтаў павелічэння дзейснасці публікацый — вяртанне да практыкі накіравання іх на рэагаванне. Досвед пераконвае, што такі шлях — найбольш эфектыўны. Вельмі слушная парада наконт матэрыялаў для маладых спецыялістаў. Натуральна, ім патрэбны парады і старэйшых калег, іншым разам нават з іншых раёнаў, і спецыялістаў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Не пашкодзіла б тут і зваротная сувязь з колішнімі выкладчыкамі гэтых спецыялістаў у ВНУ і сярэдніх спецыяльных установах сферы культуры. Таксама маглі б размяшчацца лісты саміх герояў рубрыкі з пытаннямі, прапановамі, прэтэнзіямі.

Ідэі сяброў

Што для маладога спецыяліста?

У Іванаўскай раённай бібліятэцы з журналістамі "К" сустрэліся работнікі культуры. Дарэчы, гэта ўжо другая па ліку выязная рэдакцыя нашай газеты ў Іванаве. Першая, праведзеная сем гадоў таму, была ініцыявана начальнікам аддзела культуры. Чарговая сустрэча аказалася канструктыўнай і карыснай для абодвух бакоў.

Дырэктар мясцовай ДШМ Святлана КАЛОДЗІЧ прапанавала змяшчаць матэрыялы ў дапамогу маладому спецыялісту, якога проста неабходна падтрымаць на пачатковым этапе ягонай працоўнай дзейнасці: "Парады, мяркую, могуць мець псіхалагічны, юрыдычны, эканамічны характар."

Пра патрэбу і неабходнасць пастаяннага ўдасканалення нашага "Куфра-радцы" гаварыла **намеснік дырэктара райбібліятэкі Ніна КУЛІЧ.** Каб "К" пастаянна трымала руку на пульсе раённага жыцця, якое імкліва змяняецца, **дырэктар ЦБС Людміла СІДАРЦАВА** прапанавала друкаваць анкету для чытачоў, што пасля запаўнення і наладжвання зваротнай сувязі апаратыўна падказвала б журналістам, якія тэмы турбуюць сёння раённых работнікаў культуры.

Сустрэча на Іванаўшчыне.

вынікова і не "з нуля"

Не застацца з "такам", трымацца на плаву

фартушкоў. Насустрач пайшло і кіраўніцтва раёна. Было гэта ў 1999 годзе. Неўзабаве з'явілася ідэя стварэння падворка з гасцінічным нумарам і комплексам самых розных забаўляльна-кулінарных паслуг. "Бездзежскі фартушок" атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. Пасля гэтага з'явілася магчымасць рэалізаваць задуманае". Усё. Змог давесці, што твой праект патрэбны, — застаўся на плаву. Не змог — застаўся з "такам".

Дык што такое "на плаву" па-бездзежску? Гэта сядзіба "Каля Плэса": магчымасць не толькі павудзіць на рэчцы Плёса, але і пажыць у сялянскай хаце, дзе ёсць камфартабельны нумар коштам у 300 тысяч рублёў за суткі, пачаставацца вясковымі стравамі (за дадатковую плату), паглядзець, як у печы выпякаецца хлеб. Словам, можна адчуць сябе часткай самага сапраўднага вясковага побыту. У штаце падворка — чатыры чалавекі, якія даглядаюць за гаспадаркай: казой, хатняй птушкай, канём па мянушцы Індзеец... Але гэта толькі пачатак.

Начальнік аддзела культуры мяркуе стварыць сапраўдны гасцінічны комплекс, а таксама — лазню. Не пабудаваць гасцініцу з нуля, а выкарыстаць ужо наяўныя вясковыя памяшканні. Балазе вопыт ужо ёсць. Вось вам і спалучэнне творчасці ды гаспадарчай разворотлівасці.

Ці ёсць у культуры Беларусі аналагі вось такой гасцінічна-турыстычнай структуры, ускладзенай на баланс раённых аддзелаў? Ёсць: на Браслаўшчыне ды Іўеўшчыне. Больш прыкладаў, напэўна, і не ўзгадаць. А выснова толькі адна: у названых раёнах, у тым ліку і ў Драгічынскім, аддзелы культуры не забываюцца пра немалы турыстычны патэнцыял краіны, таму і рупяцца пра будучае ўласнае развіццё.

Дырэктар "Бездзежскага фартушка" Марыя Астаповіч на сядзібе "Каля Плэса".

Падарунак ад "Беларусбанка"

А зараз — аб праекце чыста гаспадарчага кшталту (гаспадарчага, прынамсі, на першым этапе яго рэалізацыі). Школа мастацтваў у Драгічыне не магла пахваліцца навізной уласнага будынка. Дзейнічаць яна пачала больш як паўстагоддзя таму. Мала таго, што прыйшла за гэты час у аварыйны стан, дык яшчэ і не ўсіх ахвотных вучыцца змяшчала: юныя мастакі былі вымушаны займацца ў памяшканнях Дома культуры.

Лішне казаць, што такая сітуацыя не магла задаволіць ні начальніка аддзела культуры Леаніда Куроўскага, ні дырэктара ДШМ Сяргея Падлужнага. Пачаліся перамовы з "Беларусбанкам", мясцовае аддзяленне якога мела магчымасць перадаць адзін са сваіх будынкаў у камунальную ўласнасць раёна. І толькі начальнік абласнога ўпраўлення культуры Сяргей Панасюк ды Куроўскі з Падлужным ведаюць, наколькі "простай" аказалася гэтая перадача. Інакш кажучы, не да творчасці ім было. Аднак хтосьці калісьці назваў дыпламатыю мастацтвам найвышэйшага кшталту. Калі гэта сапраўды так, дык начальнік аддзела і кіраўнік школы — асобы ў мастацтве выбітныя. Словам, паўгода таму "Беларусбанк" зрабіў драгічынскім дзецям падарунак.

На рэканструкцыю будынка пад патрэбы ДШМ быў выкарыстаны за гэты час 1 мільярд 600 мільёнаў рублёў з абласнога бюджэту. Дзень 20 снежня 2012 года стаў для школы з паўвекавой гісторыяй другім днём нараджэння. Адбыліся ўрачысты сход, шыкоўны канцэрт ды безліч праяў радасці — і бацькоўскай, і дзіцячай. Супрацоўнікі ж аддзела культуры пасля бясконцых гаспадарчых клопатаў, звязаных з неадкладнасцю школьных пярэбараў, адчулі сапраўднае творчае задавальненне: у чарговы раз каманда спрацавала ўдала.

Бізнес-праект "Бездзежскага фартушка" на "гатэльным" тракце.

Што змянілася пасля пярэбараў? Мастакі аб'ядналіся з музыкамі. У педагогаў значна паболела навучальных кабінетаў. Павялічыліся памеры глядзельнай залы. Натуральна, павысілася колькасць навучэнцаў.

Канешне, па словах дырэктара ДШМ, патрэб ва ўстановы яшчэ шмат: патрэбны новыя музычныя інструменты і мэбля...

Матэрыялы паласы падрыхтавалі Яўген РАГІН і Юрый ІВАНОЎ (фота)

Рэзюмэ "К" у дарозе

Каманда працягвае дзейнічаць: выдумляць ды рэалізоўваць. Пачакаем і пабачым, якім будзе чарговы вынік гэтых творча-гаспадарчых стараннаў. Застаецца дадаць толькі адно. Па рэспубліцы такіх вось аварыйных сітуацый з ДШМ калі і не шмат, дык і не мала. Але далёка не паўсюль яны вырашаюцца так, як у Драгічыне. А шкада.

Брэст — горад, які можа пахваліцца шматлікімі адметнасцямі ды цікавосткамі: пачынаючы з аднаўлення традыцыі запальваць увечары ліхтары на галоўнай вуліцы горада (і штодня гэты прыгожы рытуал здзяйсняе "прафесійны" ліхтаршчык) да Музея выратаваных каштоўнасцей. Але ж гэтым разам сапраўдным адкрыццём для нас стаў Брэсцкі абласны краязнаўчы музей, які прапанаваў найцікавую экскурсію па адрамантаваных і "апгрэйджаных" залах. У выніку ўстанова стала для нас прыкладам музея "новай генерацыі".

Інтэр'еры залаў: ад асветнікаў да шляхецкіх баляў.

Музейнае сховішча

БРЭСЦКІ "БРЫСТОЛЬ" з інтэрактыўным "цвіком"

Рэбрэндынг музейнай "перліны" з вагончыкам і дырыжаблем

Загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела музея Ніна Кірылава і галоўны спецыяліст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Вячаслаў Гарбузаў робяць "тэст-драйв" друкарскага станка.



Віртуальна-рэальнае экспанаванне той самай амфары.

Прастора фае была густоўна афармлена ў стылі мадэрн і ўжо заяўляла пра тое, што нас чакае сустрэча з амбітным ды арыгінальным праектам. Мы не памыліліся.

— Больш за сто гадоў таму ў гэтым будынку знаходзіліся Зімні Тэатр і гатэль "Брыстоль", — увяла ў гісторыю помніка архітэктуры XIX стагоддзя загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела музея Ніна Кірылава. — Таму і мастацкае рашэнне нашага фае вытрымана ў гэтым ключы: нібыта сям'я прыязджае ў Брэст-Літоўск і засяляецца ў гатэль. Вы можаце тут бачыць атрыбуты падарожнага і гасцінічнага жыцця пачатку XX стагоддзя, — паказала яна на старыя чамаданы.

Толькі ўвосень Брэсцкі абласны завяршыў працу па рамонце і новым напаўненні шасці сваіх залаў. Такім чынам, камандзе "К" пашчасціла пазнаёміцца з адноўленай экспазіцыяй, як кажуць, "у першых шэрагах".

"Віртуальная" амфара і гукавая дыярама

Гістарычныя артэфакты перыяду першабытнага ладу музей атрымаў ад супрацоўнікаў Нацыянальнай акадэміі навук, якія ў 90-я гады мінулага стагоддзя знайшлі ў Іванаўскім раёне ля вёсак Моталь і Тышкевічы 32 паселішчы старажытнага чалавека.

Ніна Кірылава падводзіць нас да незвычайнай канструкцыі:

— А гэты дзіўны экспанат — навуковая рэканструкцыя старажытнай амфары, знойдзенай пад час раскопак Моталя. Яна датуецца трэцім тысячагоддзем да нашай эры і з'яўляецца самым старажытным сасудам культуры шнуравой керамікі на тэрыторыі Беларусі…

Увагу прыцягвае не толькі стары век артэфакта, але, уласна, і спосаб экспанавання: амфара прадстаўлена публіцы амаль у віртуальным выглядзе: на спецыяльнай канструкцыі — толькі некалькі аскепкаў сасуда, астатняе месца — пустка. Але ж дзякуючы каркасу наведвальнікі могуць уявіць, якога памеру і формы была амфара. Завяршае ўражанне павольны рух "віртуальнай" канструкцыі вакол сваёй восі. Прызнацца, мы не чакалі ўбачыць такі сучасны спосаб экспанавання.

Не паспелі падзівіцца на гэты аб'ект, як Ніна Міхайлаўна распавядае нам пра яшчэ адзін "цвік" экспазіцыі — дыярраму паселішча паляўнічых і рыбаловаў на рэчцы Ясельда эпохі неаліту.

— Сюжэт, кожны аб'ект гэтай дыярамы ўзгоднены са спецыялістамі Нацыянальнай акадэміі навук, — адзначае яна. — Плён сямі навук пакладзены ў яе аснову. Таму карціна, якую вы бачыце, максімальна набліжана да карціны паўсядзённых спраў тых часоў…

І, зноў-такі, не паспелі мы разгледзець герояў змястоўнай дыярамы, як Ніна Міхайлаўна дадала новую інфармацыю: дыярама мае гукавое суправаджэнне.

— Дзякуючы дапамозе тэлекампаніі "Брэст", сёння нашы наведвальнікі здолеюць заглыбіцца на некалькі хвілін у першабытную эпоху, — загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела звяртае ўвагі на дэталі. — Вы можаце пачуць самыя разнастайныя гукі: як брэша сабака, як плача дзіця… Але самы каштоўны з іх — гаворка чалавека эпохі неаліту. Хто з нас ведае, як ён размаўляў? Аднак сёння мы можам пачуць рэканструкцыю яго мовы і дзякуючы даследаванням замежных тэлекампаній — той жа BBC…

Але і гэтым не вычэрпваліся цікавосткі першай залы: асобнае месца ў ёй займае рэканструкцыя пахавання дзяўчынкі вельбарскай культуры.



Такая "ілюстрацыя" на сцяне нагадвае пра гатэльнае мінулае будынка.

— Уявіце сабе, былому супрацоўніку нашага музея, а сёння супрацоўніку аддзела археалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзіму Беляўцу ў 2000-я ўдалося раскапаць ля вёскі Пятровічы Жабінкаўскага раёна бірытуальны могільнік, — расказвае Ніна Кірылава. — Такі прыклад — адзіны на Беларусі…

Адно з тых знойдзеных пахаванняў належыла дзяўчынцы з багатай сям'і. Зрабіць рэканструкцыю гэтага пахавання Брэсцкі абласны і папрасіў былога супрацоўніка.

Каманда "К" у купэ музейнага "цягніка" з Брэста ў Лунінец.

У спецыяльнай ёмістасці адмысловым чынам узноўлены рытуал пахавання: размешчана адзенне і ўпрыгожанні дзяўчынкі. Сярод іх, да прыкладу, каралі з 88 фрагментаў: срэбра, бурштыну і шкла.

Друкарскі станок і "паравоз" у Лунінец

У наступнай зале музея, прысвечанай гісторыі Брэстчыны ў эпоху Ранняга Сярэднявечча, Ніна Міхайлаўна звярнула нашу ўвагу на язычніцкія каменныя ідалы, знойдзеныя ў Жабінкаўскім раёне.

— Іх у нашым музеі два, — падкрэсліла яна, — але калі ўлічыць, што з дваццаці шасці, якія былі выяўлены на тэрыторыі Беларусі, на сёння захавалася толькі дзевяць, то два дахрысціянскія ідалы ў адным музеі — гэта не так і мала…

У наступнай зале нас чакае яшчэ адзін сюрпрыз — экспанат, што прымусіў папрацаваць не аднаго карэспандэнта нашага выдання, прыклаўшы да яго сілу пад прэсам вагой 600 кілаграм. Экспанат гэты — друкарскі станок перыяду Вялікага Княства Літоўскага, зроблены… у мініяцюры.

— Мы звярнуліся да мастака Юрыя Сухава (ён і афармляў гэтую новую экспазіцыю) з просьбай зрабіць друкарскі станок адпаведна прапорцыям нашай залы, — тлумачыць Ніна Міхайлаўна. — І вось, перад вамі — тая машына, на якой надрукаваць кніжны знак на паперы можа нават дзяўчына…

Аўтар гэтых радкоў асабіста зрабіў адбітак на паперы, павярнуўшы спецыяльны рычаг, і можа зазначыць, што той працэс не запатрабаваў вялікіх высілкаў. Вядома, ад спакусы адчуць сябе ў ролі Францыска Скарыны не адмовіліся астатнія ўдзельнікі экскурсіі — і таксама надрукавалі сваю першую старонку на друкарскім станку XVI стагоддзя.

Зразумела, што наша цікавасць выявіла выдатную магчымасць аказання платных паслуг для музея — на прыкладзе інтэрактыўнага экспаната.

— Так усё і запланавана, — пацвердзіла стратэгію ўстановы Ніна Кірылава. — Але друкарскі станок — не адзін падобны прадмет у нашай экспазіцыі.

Міма страдзецкага скарбу сярэбраных паясоў, выявы рэканструкцыі інтэр'ераў Ружанскага палаца Сапегаў крочым у залу, якая распавядае пра гісторыю брэсцкай зямлі ў складзе Расійскай імперыі.

— Наш калектыў усё думаў, праз што жа можна расказаць пра горад Брэст як пра буйны чыгуначны вузел, — робіць своеасаблівыя ўводзіны экскурсавод перад прэзентацыяй экспаната, — і вырашылі стварыць рэканструкцыю пасажырскага вагона. У ім вы сёння можаце нават "пракаціцца", — і Ніна Міхайлаўна адкрыла дзверы ў стылізаванае купэ.

Зразумела, адмовіць сабе ў такім падарожжы ў мінулае — 1912 год — каманда "К" не здолела. У маленькай утульнай кабінцы ўмяшчаюцца чацвёра. Як толькі сядаеш на крэсла — цягнік пачынае нібыта рухацца. За акном — выявы чыгуначнага Брэста і "яго ваколіц", а насамрэч — унікальнае слайд-шоу з выкарыстаннем фатаграфій гарадоў Брэстчыны пачатку XX стагоддзя. "Ваколіцы", як высветлілася, аказаліся маршрутам "Брэст — Літоўск — Лунінец", і наша каманда з вялікім задавальненнем і, лічы, з ветрыкам, "пракацілася" да таго самага Лунінца.

Прыемнае падарожжа на "брэсцкім паравозіку" канчаткова пераканала нас у тым, што Брэсцкі абласны краязнаўчы музей на прыкладзе і экспазіцыйных рашэнняў, і новага напаўнення можа "даць фору" шматлікім сталічным музейным установам. Інтэрактыўныя экспанаты, новыя пошукавыя і навуковыя дасягненні, мастацкае аздабленне (чаго вартае, да прыкладу, генеалагічнае дрэва князёў ВКЛ, выява якога вабіць вока на сцяне адмысловай залы) — гэта склалася ў сучасны комплекс, дзе ўсё прадумана, закальцавана і, адначасова, жыва і цікава. Такі музей папраўдзе здольны прывабіць спакушанага сучасніка.

Напрыканцы нашай экскурсіі дырэктар Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея Аляксей Міцюкоў прызнаўся, што ўдалыя крэатыўныя захады сваіх падначаленых ён імкнецца падтрымліваць ды стымуляваць фінансава. Магчыма, і гэты ход адыграў немалаважную ролю ў стварэнні, інакш і не скажаш, музейнай "перліны" Брэста.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ
Фота Фёдара АФАНАСЬЕВА

"Песня пра долю": рок-опера "на адлегласці"

Спасцігнуць спадчыну Уладзіміра Мулявіна

Сёння — дзесяць гадоў з дня смерці народнага артыста Беларусі, народнага артыста СССР Уладзіміра Мулявіна. Канал "Беларусь-1" адзначыць гэтую дату трансляцыяй нядаўняга філарманічнага паказу яго "Песні пра долю" паводле Янкі Купалы. Гэты твор, як вядома, летась быў адноўлены, прычым для іншага выканальніцкага складу — Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І.Жыновіча пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны, прафесара Міхаіла Казінца і, зразумела, салістаў. Другое па ліку прадстаўленне публіцы гэтай буйной работы адбылося ў 73-ю гадавіну з дня нараджэння творцы — 12 студзеня. Што значыць для Беларусі гэты твор і сама постаць Вялікага Песняра? Як змянілася цяперашняе прачытанне ўвасобленых вобразаў? З гэтымі распытамі мы і звярнуліся да некаторых салістаў нядаўняй прэм'еры.

Арыя Купалы

Лаўрэат міжнародных конкурсаў Пётр ЯЛФІМАЎ выканаў у "Песні пра долю" ролю Янкі Купалы. І гэта невыпадкова: апрача пошуку ды стварэння новага музычнага матэрыялу, ён рэгулярна робіць новыя апрацоўкі вядомых песень, у тым ліку з рэпертуару "Песняроў", удзельнічае амаль ва ўсіх праектах, прысвечаных ушанаванню памяці Уладзіміра Мулявіна.

— Творчасць Мулявіна, — кажа Пётр Ялфімаў, — мне вельмі блізкая. На жаль, я не быў знаёмы з ім асабіста, але з вялікай павагай стаўлюся да ўсяго, што было ім зроблена, сябрую з яго сваякамі. І нібыта адчуваю Уладзіміра Георгіевіча сваім старэйшым сябрам. Той творчы ўнёсак, што ён зрабіў у нашу нацыянальную культуру, пераацаніць немагчыма. Думаю, яшчэ не адно пакаленне нашых музыкантаў будзе па-новаму перажываць яго творы, "прапускаць" іх праз сябе, знаходзіць не заўважаныя раней асаблівасці, надзвычай цікавыя і актуальныя.

Тая ж "Песня пра долю". Калісьці, пры ўсёй папулярнасці гэтага твора, ён успрымаўся, пэўна, усяго толькі адным з чарговых "песняроўскіх" творчых праектаў. Сёння ж мы можам здзівіцца таму, наколькі гэтая рок-опера засталася сучаснай (і нават найсучаснай!), быццам была народжана акурат цяперашнім часам. Каб ужыцца ў ролю Янкі Купалы, я перачытваў яго творы, вывучаў біяграфію, супярэчлівыя гістарычныя сведчанні, імкнуўся спасцігнуць сам характар паэта, ягоны "партрэт", настрой у той або іншы момант, побытавыя схільнасці — ажно да густаў у адзенні. Партыя паэта не прадугледжвае разгорнутых арый — яна, хутчэй апавядальная. Але ўсё, што ён распавядае і ведае, адбываецца з яго героямі.

Повязь фольку з сімвалізмам, што акрэслена ў гэтым творы на ўсіх узроўнях — ад паэтыкі да ўласна музыкі Уладзіміра Мулявіна, — нашмат апярэдзіла час. І таму стала такой відавочнай хіба цяпер, пры новым звароце да "Песні пра долю", пры яе "перакладзе" на мову народнага аркестра, здзейсненым Аляксандрам Крамко, пры глыбокім рэжысёрскім асэнсаванні, зробленым кампазітарам Ларысай Сімаковіч. Ну а цяперашняе выкананне, якое адбылося прыблізна праз дзевяць месяцаў пасля леташняй прэм'еры адноўленага твора, нарадзіла, трэба спадзявацца, і новыя адкрыцці.

Арыя Мужыка

Ян ЖАНЧАК — таксама далёка не выпадковы ўдзельнік гэтага і іншых вечароў памяці Уладзіміра Мулявіна. Ён паспеў паўдзельнічаць у курце "Лявоны". Дый цяперашняя ягоная творчасць шмат у чым працягвае закладзеныя майстрам традыцыі спалучэння фальклорных павеваў з рок-стылістыкай.

— Другое выкананне "Песні пра долю", што адбылося днямі, — заўважыў Ян Жанчак, — падалося мне ў некаторых момантах больш скаардынаваным. Прэм'ерны паказ звычайна вылучаецца большай свежасцю, натуральнасцю ўспрыняцця, асабліва ў публікі. Затое паўторнае далучэнне да твора, а тым больш — праз некаторы час, "на адлегласці", дае той жа публіцы, як вельмі хочацца спадзявацца, больш глыбокае асэнсаванне многіх рэчаў.

Рыхтуючы сваю партыю, я зусім не імкнуўся паўтарыць у жыцці ўсё, што адбываецца з маім персанажам — Мужыком: не ездзіў у вёску, не працаваў на сенажаці, не спаў у завею ў гурбе снегу. Галоўнае было, як мне здаецца, — падкрэсліць трагічны ўхіл гэтага твора. Самым цяжкім аказалася за кароткі прамежак часу адлюстраваць чалавека на працягу ўсяго жыцця: ад бесклапотнага дзяцінства да смерці. Я намагаўся перадаць гэта ўжо самім голасам. Таму на пачатку спяваў чыстым, "маладым" тэмбрам, а потым — з гэткай хрыпатцой…

Паступова, спакваля, адбываецца нашае пранікненне ў творчасць Уладзіміра Мулявіна. Ягоная дзейнасць і сёння натхняе! Бо ён акрэсліў той шлях, якім павінна рухацца любая нацыянальная культура. З аднаго боку, яна павінна быць блізкай да карэнных нацыянальных з'яў, з іншага ж — суадносіцца з сучаснасцю ды найноўшымі сусветнымі тэндэнцыямі. З гуртом "Янкі", што я развіваю, мы падрыхтавалі максі-сінгл. Будзем рассылаць яго па радыёстанцыях. Супрацоўнічаю я і з сібірскім гуртом "Азазэла", які гастралюе па Расіі і ў замежжы. Цікава, з гэтым калектывам я пазнаёміўся на гастролях з "Песнярамі" Леаніда Барткевіча ў Тындзе…

Арыя Маці

Лаўрэат міжнародных конкурсаў Кацярына ДЗЕГЦЯРОВА — салістка Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. І хаця ўдзельнічае яна ў вельмі многіх спектаклях, усё ж ейнай "спецыялізацыяй", на маю думку, з'яўляюцца мюзіклы. Тут папраўдзе няма ёй роўных, і "Песня пра долю", дзе яднаюцца фольк і рок, стала для спявачкі настолькі арганічнай, быццам была напісана менавіта для яе.

У гэтым творы ёй даводзіцца ўвасабляць адразу ўсе жаночыя вобразы: Маці, Нявесты, Удавы, нават Дзевы Марыі. Бо тое, як маці аплакае загінулага сына, міжволі адсылае нас да еўрапейскага жанру Stabat mater, беларускіх псалмоў ды жальбаў. Спявачка стала сапраўдным адкрыццём для дасведчанай філарманічнай публікі яшчэ на прэм'еры гэтай рок-оперы. А ў час другога паказу ўразіла і новымі сцэнічнымі строямі — не фантазійна-тэатральнымі, а быццам бы аўтэнтычнымі. Аказалася, гледачы не памылілісь: гэтым разам салістка выступала ў… адзенні сваёй бабулі.

— У дзяцінстве я часцяком праводзіла лета ў сваёй бабулі, маці майго бацькі, — распавяла Кацярына Дзегцярова. — Яна родам з Гомеля, там і жыла, а ў вёсцы Хаціўля, што на Чарнігаўшчыне, у яе быў домік — штосьці накшталт лецішча. Там не было нават электрычнасці: мы запальвалі газавую лямпу. І гэта было так незвычайна, таямніча: вось запальваецца лямпа — і ты трапляеш у даўніну. А ўсё таму, што ў бабулі быў куфар, і па вечарах, скончыўшы працу на гародзе, яна любіла перабіраць у ім розныя рэчы і расказваць мне пра кожную з іх, што там захоўваліся. Якое там было багацце! Спадніцы, сарочкі, сукенкі, андаракі, ручнікі — і ўсё вышыванае, зробленае ўласнымі рукамі. Яна шмат распавядала і пра вайну, і пра мірныя часы, пра тое як жылі, працавалі, святкавалі, як пасаг сабе рыхтавалі. Гэта проста фантастыка! Памятаю, мяне, маленькую, асабліва ўражвала, што ўсё гэта шылася і вышывалася без аніякай выкрайкі, папярэдніх малюнкаў, канвы — адразу на палатне. Слухаць было так цікава! А яшчэ яна спявала многа песень. Але я іх не запомніла, і зараз вельмі шкадую, што не вывучыла, не запісала…

Той куфэрак потым перайшоў у спадчыну бабулінай дачцэ — маёй цётачцы. І гэтым летам, даведаўшыся, што я выконвала "Песню пра долю", яна перадала мне частку рарытэтаў. Там ёсць нават бабуліна шлюбная сукенка — я выходзіла ў ёй у сцэне вяселля. Увогуле ж, пераапраналася літаральна ў кожнай сцэне, і ўсе строі, апроч апошняга, былі бабуліны: вельмі дарэчы яны прыйшліся ў гэтым творы. Апранаючы іх, пачуваеш сябе зусім інакш. Бо разам з рэчамі, іх нейкай унутранай энергетыкай табе быццам перадаецца гэта памяць стагоддзяў, уяўленні нашых продкаў.

Арыя Лета

Акрамя звыклых дзеючых асоб, вялікую ролю ў творы адыгрываюць персаніфікаванья сімвалы: Голад, Холад, Вясна, Лета, Восень, Зіма. Яны выступаюць не столькі як звычайныя поры года, што ствараюць прыродны колазварот, колькі як яшчэ адно ўвасабленне найвышэйшых сіл, часта варожых, якія ўплываюць на лёс Мужыка, не даюць яму таго шчасця, якога б ён заслугоўваў. Гэтыя партыі былі раскіданы на мужчынскі квартэт, удзельнікам якога даводзілася спяваць і бэк-вакал (яго ў гэтым творы шмат), і сола, прычым некаторым — адразу за некалькіх персанажаў-сімвалаў. Той жа Андрусь ДАНІЛЕВІЧ, студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і адначасова артыст хору Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, спяваў паперамена дзве партыі: спачатку разам з Андрэем Коласавым, вядомым па колішнім конкурсе "Славянскага базару ў Віцебску", яны дуэтам увасаблялі Голад і Холад. Потым Андрусь паўстаў у ролі Лета.

— Удзел у гэтым праекце, — распавёў Андрусь Данілевіч, — быў для мяне вельмі важным. Вялікі гонар — спяваць на адной сцэне, у адным творы разам з прызнанымі майстрамі, цудоўным аркестрам пад кіраўніцтвам маэстра Міхаіла Казінца. Але яшчэ большае хваляванне і адказнасць — дакрануцца да творчай спадчыны Уладзіміра Мулявіна…

Я ўвогуле аматар старой рок-музыкі — 1970 — 80-х. Уцяміўшы, што "Песня пра долю" была напісана больш як сорак гадоў таму, у 1972-м, разумееш, наколькі яна апярэдзіла свой час і якое вялізнае ўздзеянне аказала, наўпрост і ўскосна, на ўсё далейшае развіццё як беларускай, так і ўсёй савецкай эстрады.

Тое, што Аляксандр Крамко па слыху, з далёка не лепшага побытавага запісу зрабіў новую аранжыроўку, можна расцэньваць як сапраўдны творчы подзвіг. І ўвесь гэты праект, узняты цудоўным аркестравым калектывам, сімвалізуе чарговую прыступку ў развіцці выканальніцтва на народных інструментах.

Асабіста я зрабіў і такое адкрыццё ў творчасці Уладзіміра Мулявіна, як унікальная, па сутнасці, індывідуалізацыя галасоў у бэк-вакале. Шчыльныя ансамблевыя "пачакі" ствараюць не толькі арыгінальныя, прыгожыя гармоніі — у іх цікава развіваецца кожная спеўная лінія. Атрымліваецца гэткі падвойны мастацкі сэнс: і па вертыкалі, і па гарызанталі. Такі твор трэба папулярызаваць як мага шырэй, ён годны таго, каб яго паказваць на фестывалях міжнароднага статуса — на тым жа "Славянскім базары ў Віцебску", вывозіць за мяжу.

А якія яркія вобразы! Мне, на першы погляд, можна было б і паскардзіцца на партыю Лета: невялікі дыяпазон, выразнай кантылены, дзе можна голас разгарнуць, няма. Затое на кожным кроку — метра-рытмічныя змены-"збіўкі", паўторы адной ноты, на якіх спевакам бывае складана ўтрымацца, не панізіўшы тону. Але ж які ва ўсім гэтым жанрава-тэатральны струмень, колькі ўкладзена супрацьлеглых эмоцый, асацыяцый! Так што спасцігаць нам спадчыну Уладзіміра Мулявіна яшчэ доўга…

Надзея БУНЦЭВІЧ

Фота з архіва Юрыя ІВАНОВА і Юрыя БУДЗЬКО

Восенню 2001-га рэдакцыя нашай газеты запрашала на вечар, прысвечаны 10-годдзю выдання. Урачыстасць праходзіла на Малой сцэне Купалаўскага тэатра. Сабраліся чытачы, сябры рэдакцыі, прыхільнікі. З усіх выступленняў у гонар "юбіляра" запомнілася віншаванне рэжысёра Міхаіла Пташука — даўняга члена рэдакцыйнай калегіі, роднага для "Культуры" чалавека. Добрыя словы на адрас газеты ён дапоўніў незвычайным падарункам — экзатычнай раслінай з раскідзістымі галінкамі, якая зіхацела дробненькімі, але на дзіва прыгожымі белымі кветкамі, падобнымі на маленькія калы...



Міхаіл Пташук на здымках фільма "Чорны замак Альшанскі".

Пад час здымак фільма "У чэрвені 41-га".



Здымаецца стужка "У жніўні 44-га".

Міхаіл Пташук. Знак і Момант

"Падрабязнасці паведамлю пазней, па вяртанні..."

Расліна гэтая — "дрэва Пташука" — з тых часоў упрыгожвае памяшканне нашай рэдакцыі. Жывы ўспамін пра доўгія сяброўскія размовы-пасядзелкі ў будынку па вуліцы Чычэрына, дзе на адным паверсе месцілася наша рэдакцыя, а на суседнім — Міхаіл Пташук вучыў будучых рэжысёраў сваёй надзвычай складанай, але такой захапляльнай прафесіі. І часта прыходзіў у госці — нават не як член рэдкалегіі, а як самы добры сябра…

Не дзіва, што менавіта да рэдактара аддзела "Культуры", мастацтвазнаўцы Барыса Крэпака рэжысёр прыслухаўся тады, калі ўзнікла пытанне, каго ж запрасіць на ролю капітана Алёхіна — цэнтральную ў знакамітай экранізацыі рамана "Момант ісціны" Уладзіміра Багамолава — "У жніўні 44-га...". На прапанову ўзяць Яўгенія Міронава Пташук адрэагаваў спачатку здзіўлена. Маўляў, а ці пагодзіцца ўжо знакаміты на той час маскоўскі акцёр на ролю ў фільме беларускай студыі? Потым, адразу пасля маскоўскай прэм'еры карціны, якая ў момант стала культавай, праслаўлены артыст так казаў у эксклюзіўным інтэрв'ю галоўнаму рэдактару "Культуры" Людміле Крушынскай: "Мне было неверагодна цікава працаваць на гэтай карціне! Такі напружаны драматургічны матэрыял трапляецца акцёру вельмі рэдка…" Міхаіл Мікалаевіч у адказ за добрую ідэю падарыў Барысу Крэпаку "аўтэнтычную" салдацкую флягу, якая "здымалася" ў стужцы…

Працаваць з Пташуком было марай для любога прафесіянала. "Культура"ўцы з ім проста сябравалі. І любілі яго, часта "правакуючы" пры гэтым да недзяжурных гутарак, найцікавейшых інтэрв'ю.

...Тую гутарку карэспандэнт нашай газеты Дар'я Амяльковіч рыхтавала да выпуску, прысвечанага Дню Перамогі, — 9 Мая. "У жніўні 44-га..." ужо цягам года не сыходзіла з тэлеэкранаў. Аднак яе стваральнік паспеў зняць яшчэ адну стужку па замове галівудскіх прадзюсараў і збіраўся паехаць у Амерыку, дзе планаваў прадоўжыць працу над здымачным матэрыялам.

"Я буду здымаць карціну для амерыканцаў, але мне хочацца падкрэсліць у ёй мае карані", — казаў тады Міхаіл Мікалаевіч.

Хто ведаў, што гэтыя словы Пташука стануць апошнімі на старонках нашага выдання?.. Інтэрв'ю выйшла праз пару дзён пасля трагічнай гібелі рэжысёра, ужо на жалобнай паласе, — апошняе інтэрв'ю Пташука не толькі для "Культуры", але і для СМІ наогул. Побач з ім рэдакцыя змясціла апошні здымак Майстра — разам з яго студэнтамі, — што зрабіў за чатыры дні да заўчаснага сыходу рэжысёра тагачасны фатограф "К" Генадзь Жынкоў. Цяпер гэта архіўная паласа — вельмі дарагі для сэрцаў "культура"ўцаў успамін пра блізкага чалавека, якім з'яўляўся Міхаіл Мікалаевіч…

...На развітанне, перад паездкай у Маскву на цырымонію ўручэння прэміі "Ніка", рэжысёр "па сакрэце" паведаміў нам пра планы будучага візіту ў Галівуд. "Але, — дадаў ён, — падрабязнасці — пазней, па вяртанні..."

Фота з архіва Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА



кіно і тэатр

Сямёра маленькіх "пташукоў"

Міхаіл Пташук:

"Думаю, што свет яшчэ здыме фільм пра вайну, дзе будуць прадстаўлены ўсе краіны Еўропы..."

Паласа з тым самым апошнім інтэрв'ю Міхаіла Пташука.

Пад час здымак "Чорнага замка Альшанскага".

На пляцоўцы "Знака бяды".

Л.Шчамялёў. Партрэт М.Шчакаціхіна. 1977 г.

"Падарожная" да аднаго лёсу

Мікалай Шчакаціхін: "Я паспеў зрабіць штосьці для навукі..."

(Працяг. Пачатак у №№ 2, 3 за 2013 г.)

...Але ўсе гэтыя лекцыі пра рускіх дзеячаў культуры хутка адышлі на другі план, бо Шчакаціхін вельмі сур'ёзна захапіўся гісторыяй беларускага мастацтва. Летам 1923-га ён распрацаваў курс па гісторыі і тэорыі беларускага мастацтва. У кастрычніку таго ж года абараніў даследаванне пад назвай "Ілюстрацыі Даніэля Хадавецкага да "Буры" Шэкспіра. Цяжка сказаць, чаму ён абраў для сваёй працы гэтую тэму. Можа, Хадавецкі яго натхніў, таксама, як паэта Сярэбранага веку Міхаіла Кузьміна? Памятаеце:

Наверно, нежный Ходовецкий
Гравировал мои мечты,
И сельский дом, немного детский,
И барбарисные кусты...

Даніэль Хадавецкі — нямецкі гравёр, рысавальшчык і жывапісец XVIII ст., па паходжанні паляк. Скончыў Берлінскую акадэмію мастацтваў. Напрыканцы жыцця яе ўзначальваў. Вядомыя ягоныя ілюстрацыі да кніг Гётэ, Русо, Шылера, Шекспіра, Сервантэса, Лесінга, Вальтэра, Рычардсона, шыкоўныя гравюры "Развітанне Каласа з яго сямействам", "Вільгельм Тэль", "Жыццё Бункеля", а таксама мініяцюрныя партрэты. Дарэчы, у Эрмітажы калісьці я бачыў яго цікавы афорт "Вялікі ламберны стол" (такі складны стол з зялёным сукном для картачнай гульні ў ламбер).

Вось пра гэтага мастака і расказаў Шчакаціхін, за што атрымаў рэкамендацыі на права самастойнага выкладання ва ўніверсітэце, а ў пачатку 1923 г. упершыню прачытаў курс па беларускім мастацтве. Больш за тое: за кароткі тэрмін ён падрыхтаваў рукапіс першага тома "Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва" (рукапіс кудысьці знік), а ў кастрычніку 1924-га стаў дацэнтам і... бацькам свайго першынца Валодзі (другі сын, Саша, нарадзіўся восенню 1926 г., а дачка Алена — летам 1929-га, за год да першага арышту вучонага).

Самае цікавае: Шчакаціхін так хутка вывучыў у дасканаласці беларускую мову, што ўжо на пачатку 1925-га чытаў свае лекцыі на ёй! Тады ж яго прызначылі на пасаду навуковага сакратара Секцыі беларускага мастацтва, потым — старшынёй Камісіі гісторыі мастацтваў пры Інстытуце беларускай культуры, які праз чатыры гады быў рэарганізаваны ў Беларускую акадэмію навук. Акрамя ўласна навуковай працы, Шчакаціхін актыўна садзейнічаў падрыхтоўцы і правядзенню Першай Усебеларускай мастацкай выстаўкі 1925 года, праводзіў экспедыцыі па даследаванні і вывучэнні старажытных помнікаў Беларусі, займаўся бібліятэчнай і архіўнай працай у Мінску, Маскве і Ленінградзе, друкаваўся ў газетах "Звязда", "Савецкая Беларусь", "Чырвоная Беларусь", у часопісах "Трыбуна мастацтва", "Наш край", "Полымя", у "Гістарычна-археалагічным зборніку" Інбелкульта і г. д. Пісаў пра фрэскі Полацкага Барысаглебскага манастыра, пра сярэднявечнага магілёўскага гравёра Васіля Вашчанку, жывапісца Міхася Філіповіча і мастака XVIII ст. Рыгора Мядзвецкага, пра старажытную беларускую архітэктуру ды сучаснае айчыннае мастацтва 1920-х гадоў.

Шчакаціхін першым у савецкай Беларусі звярнуўся да спадчыны Францыска Скарыны: аналітычныя артыкулы "Дрэварыты і арнамент у выданнях Скарыны", "Калі нарадзіўся Францішак Скарына", "Гравюры і кніжныя аздобы ў выданнях Францішка Скарыны", "Да пытання аб храналогіі "Малой падарожнай кніжыцы" Скарыны". А яшчэ займаўся фалерыстыкай (калекцыянаванне памятных медалёў), сфрагістыкай (гістарычная дысцыпліна, якая вывучае пячаткі ды іх адбіткі на розных матэрыялах), нумізматыкай, тапаграфіяй манетных знаходак, цікавіўся філатэліяй і быў членам Беларускага аддзялення Усерасійскага таварыства філатэлістаў. У аўтабіяграфіі, напісанай 12 жніўня 1939 г. на допыце пад час следства па справе так званага Саюза вызвалення Беларусі, ён казаў: "...Займаўся сфрагістыкай і нумізматыкай; апошнім часам па даручэнні кафедры археалогіі займаўся абагульненнем матэрыялаў па вывучэнні манетных знаходак..."



Пасведчанне Акадэміі навук Беларусі аб тым, што М.Шчакаціхін з'яўляўся яе навуковым супрацоўнікам у 1930 г.

Незадоўга да смерці ў лісце ад 2 лютага 1939-га Шчакаціхін пісаў з башкірскай ссылкі ў Мінск свайму сябру, акадэміку Уладзіміру Пічэту: "...Яшчэ напрыканцы майго знаходжання ў Мінску, калі памятаеце, стаў назірацца пэўны пералом у маіх навуковых зацікаўленнях. Пазней ён акрэсліўся канчаткова: я зусім адышоў ад гісторыі мастацтваў і стаў працаваць выключна ў галіне дапаможных дысцыплін. У гэтай галіне я і займаўся, калі жыў у Белябеі. Я напісаў і падрыхтаваў да друку дзве працы, а менавіта: 1) вадзяныя знакі Літоўскай Метрыкі (7 друкаваных аркушаў тэксту і 38 табліц з малюнкамі), 2) клады з літоўскімі манетамі як матэрыял для гісторыі літоўскай нумізматыкі і грашовага абарачэння да канца XVII ст. (каля 10 друкаваных аркушаў)..."

Сваю працу па нумізматыцы ссыльны Шчакаціхін выслаў на рэцэнзію ў ленінградскі Эрмітаж і прасіў зберагчы рукапіс. Вучоныя-нумізматы А.Ільін і Н.Баўэр далі вельмі высокі станоўчы водгук. Але справа на тым і скончылася: рукапіс Шчакаціхіна так і не быў надрукаваны. Такі ж лёс напаткаў і яшчэ адну працу вучонага — "Нарысы гісторыі літоўскай манеты XVI — XVII стагоддзяў". Мікалай Мікалаевіч пісаў Пічэту, што вывучэнне літоўскай манеты заслугоўвае асобнай кнігі, а такой кнігі няма. Тое ж, што напісана польскімі нумізматамі, — зроблена тэндэнцыйна. І далей: "...На сёння (2 лютага 1939 г. — **Б.К.**) я закончыў першую частку працы — да Люблінскай уніі. Патроху працую над другой. Але гэтую працу, пакуль яшчэ не закончаную, я нікуды не спрабаваў уладкаваць... Такія сумныя мае навуковыя справы..."



Санет, які М.Шчакаціхін прысвяціў жонцы ў 1935 г.

Дзе зараз гэты рукапіс — невядома... Яшчэ да арышту Шчакаціхін у Мінску падрыхтаваў да друку некалькі артыкулаў пад назвай "Агляд манетных знаходак Беларусі за 1926 — 1928 гг." і "Апісанне манетных знаходак на тэрыторыі Мінска", але, зноў-такі, дзе яны — таксама невядома. Зніклі і іншыя рукапісы, прысвечаныя Гродзенскаму феадальнаму і гарадскому будаўніцтву XVI ст., навуковай тэрміналогіі па гісторыі, тэорыі і тэхніцы выяўленчага мастацтва, развіцці народнага мастацтва пад уздзеяннем рэвалюцыі, ахове помнікоў мастацтва і старажытнасці Беларусі, і г. д.

Акрамя ўсяго іншага, велізарнай заслугай Шчакаціхіна было тое, што ён быў першым даследчыкам археалогіі і гісторыі старажытнай архітэктуры Беларусі. Вышэй я ўжо трошкі казаў пра віцебскую Дабравешчанскую царкву. А між тым, ён вывучаў і іншыя гістарычныя ды культурныя помнікі нашай краіны: зрабіў абмеры надземных частак полацкай Сафіі і прапанаваў план яе рэканструкцыі; даследаваў рэшткі храмаў славутага Бельчыцкага манастыра — былой рэзідэнцыі полацкіх князёў — і фрэскі Барысаглебскай ды Пятніцкай цэркваў; падрабязна апісаў унікальную будаўнічую тэхніку Каложскай царквы ў Гродне. Ён даказаў, што яшчэ ў XII ст. беларуская архітэктура, якая апынулася пад візантыйскім і заходнееўрапейскім уплывам, па-свойму перапрацоўвала замежныя формы і на аснове мясцовых асаблівасцей знайшла свой своеасаблівы мастацкі стыль.

Словам, шчырая, апантаная дзейнасць Шчакаціхіна, заснаваная на навуковым таленце, надзвычайнай энергіі, шырокай эрудыцыі і велізарных энцыклапедычных ведах на карысць беларускага адраджэння, была вельмі разнастайная. Ён па-сапраўднаму ацаніў каштоўнасць беларускіх старажытнасцей, адзначаў вялікі ўплыў беларускага мастацтва на мастацкую культуру Маскоўскай Русі і як чалавек, што ведаў шмат замежных моў, змог правесці трапныя паралелі паміж рознымі нацыянальнымі культурамі, заглыбіцца ў іх карані.

А якім ён быў чалавекам дома, у побыце, сярод сяброў? Ганна Мацвееўна Шчакаціхіна ўспамінае: "...Быў М.М. эстэтам у навуцы і жыцці. Любіў прыгожыя рэчы і абсталёўваў імі свой кабінет. Збіраў карціны, манеты, адбіткі пячатак на паперы, старадаўнія гербы на камянях... Па-дзіцячаму радаваўся, калі знаёмыя прыходзілі паглядзець яго калекцыі і называлі кабінет "музеем у мініяцюры". Пунктуальны і педантычна акуратны, М.М. быў строгі, сур'ёзны і, разам з тым, жыццярадасны, таварыскі, дасціпны, любіў танцаваць, асабліва мазурку, цаніў сур'ёзную музыку і спяваў рускія, беларускія народныя песні, акампануючы сам сабе на цытры, крыху маляваў ды пісаў вершы, добра фатаграфаваў. Заўсёды элегантна апрануты, ён выклікаў да сябе прыхільнасць людзей. Росту быў вышэй сярэдняга, хударлявы, вочы вялікія, шэрыя, насіў акуляры, валасы каштанавыя, хадзіў з кійком. З многімі М.М. сябраваў, з некаторымі сходзіўся асабліва блізка, як з прафесарамі Нікольскім і Міхайлоўскім, хірургам Трамповічам і інш. Да нас на кватэру (а жылі мы ў доме прафесуры на рагу вуліц Валадарскага і Кірава) прыходзілі супрацоўнікі М.М., студэнты. Частымі гасцямі былі мастакі Тычына, Волкаў, Бразер, Крыгер (памылка: маецца на ўвазе мастак Я.Кругер. — **Б.К.**), Станюта і многія іншыя. Сяброўскія адносіны звязвалі М.М. з калектывам Віцебскага мастацкага тэхнікума... Уся атмасфера нашага жыцця была насычана яго нястомнай навуковай працай, яго тонкім густам, любоўю да прыгожага і нашымі нязменнымі душэўнымі пачуццямі...".

Асабліва хачу падкрэсліць, што яго, рускага чалавека, прафесійна і эмацыйна цікавіла ўсё, што лічылася менавіта нацыянальнай беларускай культурай, і ў гэтым ён быў асобай сапраўды ўнікальнай. Як пісала Ганна Мацвееўна, Шчакаціхін "...палюбіў беларускую мову так, як любіў Беларусь, дзе расквітнела яго дараванне вучонага-даследчыка. Да канца сваіх дзён ён адчуваў у душы сябе беларусам. Спадзяваўся вельмі шмат зрабіць для Беларусі, якая стала яму роднай... Штогод выязджаў у навуковыя камандзіроўкі, у архівах вывучаў культуру старажытнай Беларусі, побыт і характар беларускага народа...". У нейкім сэнсе я магу параўнаць Шчакаціхіна з іншым ураджэнцам Расіі — Уладзімірам Мулявіным, які ў душы лічыў сябе таксама беларусам. Урэшце, ёсць і іншыя прыклады такога роду: Валянціна Гаявая, Валянцін Елізар'еў, Уладзімір Гасцюхін, Расціслаў Янкоўскі, Аляксандр Кішчанка, Яўген Чамадураў ды яшчэ шмат імёнаў, якія назаўсёды застануцца ў гісторыі нацыянальнай беларускай культуры і мастацтва...

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

Барыс КРЭПАК

АК Афіша "К"

з 26 студзеня — да 2 лютага

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- **"Алтарная скульптура і мастацкія тканіны Беларусі XVII — XIX стст.".**
- **"Сустрэча. М. Фердынандаў і А. Рэверон. Дзве гамы аднаго натхнення".**
- **"Пабачыць зямлю ўсю..."** (В.Грамыка).
- **"Вайна 1812 года вачыма відавочцаў. Графіка Х.-В. Фон Фабера дзю Фора".**
- **"Марк Шагал: жыццё і каханне".**
- Партрэт Войцэха Пуслоўскага пэндзля Валенція Ваньковіча.
- **Слуцкія паясы** з фонду Нацыянальнага мастацкага музея Літвы.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 87 96.

- Пастаянныя экспазіцыі: "Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
- **"Цярноўнік крэсаў".**
- **"Аўтапартрэт"** Валенція Ваньковіча.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка А.Вярбіцкага. **"Сучаснасць. Былое. Майстар".**

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.
- **"Вясельныя традыцыі Усходу. Японія. Індыя. Карэя".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"Водбліскі ваеннай славы".**
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст.".**
- **"Вайна 1812 г. у гісторыі Мінска".**

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Скарбы Беларусі"** (са збору музея).
- Выстаўка **"Чатыры пэндзлі: Бархатковы".**
- Выстаўка **"Душы маёй чароўнае святло".**

Дом-музей I З'езда РСДРП *г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*
- **"Народная архітэктура беларускай вёскі ў здымках Уладзіміра Шарнікава".**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"Мір стары — Мір новы"** (фотавыстаўка).
- **"Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. XXI стагоддзе (Санкт-Пецярбург)".**
- **"Пад мірным небам маладая Беларусь"** (жывапіс Аляксея Панцюка-Жукоўскага).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: 8–01770 5 51 81, 5 31 96, 2 06 02

- Выстаўка **"Вера, Надзея, Уваскрэсенне".** З Музея Рокішкскага краю (Літва).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

- Экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
- Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.
- **"Шляхам Янкі Купалы да Якуба Коласа"** (у філіяле "Мікалаеўшчына", у Мемарыяльнай сядзібе "Смольня").
- Выстаўка да 130-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа **"Якуб Колас — народны паэт Беларусі".**
- **"Таямніцы Дома Песняра".**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
- Выстаўка **"Не загаснуць зоркі ў небе"** са збору Пушкінскага запаведніка.
- **"Паэт з Нарачанскага краю".** Да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка.
- **"Ходзіць Сон ля вакон..."** (прысвечана беларускай перадачы "Калыханка").
- **"А.П. Чэхаў. Лінія жыцця"** з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея-запаведніка А.П. Чэхава "Меліхава" (Расія).

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"1812 г. Вайна і мір".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Экспазіцыі:
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- "Зала ўрачыстых прыёмаў".
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Конны партрэт генерал-фельдмаршала І.Ф. Паскевіча (1874 г.)"** (выстаўка адной карціны з калекцыі Д.Асташонка).
- **"Мінулага прасочваючы ніць..."** (мемуарная літаратура канца XVIII — XX стст.).

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ НА ПОШТУ!

НАГАДВАЕМ! ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА ЛЮТЫ І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2013 ГОДА!

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:
- **"Апякункі паэтычных нябёс".**
- **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам"** (жыццё і творчасць).

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- **"Мая Мазыршчына"** (выстаўка да 60-годдзя мастака Мікалая Дубровы).
- **"Цёплая шафа".**
- **Выстаўка аднаго экспаната — фарфоравай вазы, выробленай у Францыі ў сяр. XIX ст. на Сеўрскай мануфактуры.**
- **"Антыкварыят. Палацаў страчаная раскоша..."** (з прыватнай калекцыі С. Пуціліна).

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Класікі беларускага мастацтва".**

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вось зіма прыйшла серабрыстая..."** (работы гомельскіх мастакоў з фондаў).
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 32. Тэл.: (80232) 74-28-23.

Экспазіцыі:
- Інтэр'еры гарадскога асабняка к. XIX — пач. XX стст.
- Прагулкі па старым Гомелі.
- Гісторыя Гомеля ад старажытнасці да пачатку XX ст.

Выстаўкі:
- Фотаапараты і фотатэхніка XX ст. (каля 100 адзінак).

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

г. Гродна, вул. Замкавая, 16. Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
- **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
- **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўка:
- **"Пад Віфлеемскай зоркай"** (мастацкія творы з перламутру, ражджэсцвенскія паштоўкі канца XIX — пач. XX стст.).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Салдацкі доўг".**
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі".**

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 22 44.

- Пастаянная экспазіцыя **"Прырода Лідчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна...".**
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст.".**
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!".**
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

- **Да 27 студзеня** — кірмаш **"Усходні базар".**
- Выстаўка дзіцячай творчасці навучэнцаў школ Фрунзенскага раёна г.Мінска **"Зімні калейдаскоп".**

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1. Тэл.: 327 26 12.

- Выстаўка дыпломных работ студэнтаў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКіМ.

ТЭАТР

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

- **26, 27 — "Лебядзінае возера"** П.Чайкоўскага (Санкт-Пецярбургскі акадэмічны дзяржаўны тэатр балета імя Л.Якабсона).
- **29 — "Яўгеній Анегін"** П.Чайкоўскага.
- **30 — "Подых раманса"** (Музычныя вечары ў Вялікім).
- **31 студзеня — "Іяланта"** П.Чайкоўскага.
- **1 лютага — "Шахразада"** М.Рымскага-Корсакава.
- **2 — Сольны канцэрт народнага артыста Беларусі Фаруха Рузіматава.**

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 227 60 81.

На сцэне Цэнтральнага Дома афіцэраў:
- **26, 27 студзеня, 1, 2 лютага — "Местачковае кабарэ".**
- **28 — "Не мой"** А.Адамовіча.
- **30, 31 — "Ноч на Каляды"** паводле М. Гогаля.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

- **26 — "Тры Жызэлі"** А.Курэйчыка.
- **27 студзеня, 2 лютага — "Адамавы жарты"** С.Навуменка.
- **28 — "Ігвіта, або Як гэта рабілі ў Францыі"** Г.Фаміна.
- **29, 30 — "Дажыць да прэм'еры"** (камедыя) М.Рудкоўскага.
- **31 студзеня — "Нязваны госць"** (меладрама) С.Бартохавай.
- **1 лютага — "Адэль"** (гісторыя кахання) Я.Таганава.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

- **26 — "Айбаліт-2002"** І.Левіна. **"Бабін бунт"** Я.Пцічкіна.
- **27 — "Чырвоны Каптурык. Пакаленне NEXT"** А.Рыбнікава. **"Паяцы"** Р.Леанкавала.
- **29 — "Граф Люксембург"** Ф.Легара.
- **30 — "Вестсайдская гісторыя"** Л.Бернстайн.
- **31 студзеня — "Жызэль"** А.Адана.
- **1 лютага — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
- **2 — "Прыгоды брэменскіх музыкаў"** Г.Гладкова.
- **2 — "Аршын мал алан"** У.Гаджыбекава.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

- **26 — "Асцярожна, Соня!"** А.Усачова.
- **27 — "Марозка"** М. Шурынава.
- **29 — "Жыў-быў заяц"** М.Шувалава.
- **30 — "Аладдзін"** Н.Гернэт.
- **31 студзеня — "Хлопчык і Цень"** К.Чаркаскай, А Князькова.
- **1 лютага — "Брэменскія музыкі"** В. Ліванава, Ю.Энціна.
- **2 — "Дапытлівы слонік"** Р.Кіплінга.

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ
Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Марына САМОНЧАНКА (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН.
Спецкарэспандэнты: Пётр ВАСІЛЕЎСКІ Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290 22 50, (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон/факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2013. Індэксы 63875, 638752
Наклад 7935
24.01.2013 у 18.00
Замова 387
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

Дырэктар — ПРЫКО Алег Васільевіч
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна
Намеснік дырэктара па маркетынгу — СІДАРЭНКА Антон Васільевіч

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Тэл.: (017) 290 22 50 (прыёмная). Бухгалтэрыя: тэл.: (017) 334 57 35

9 771994 478007 13004